№ 30 (340) 22 жніўня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Акадэмік Вайтовіч

«...гэта даўняя практыка...».

Старонка 2

## Ніводнага калгасу

не засталося ў Лідзкім раёне.

Старонка 4

# Good luck, mister Arlou!

Старонка 10.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

## Хто «замовіў» РРБ-банк?

**Старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю Анатоль Тозік у лісьце, адрасаваным Аляксандру Лукашэнку, падае інфармацыю аб санкцыях у памеры 7 млрд 300 млн руб., якія ўжо былі нібыта прыменены да «РРБ-банку». Насамрэч пакуль што ні пра якія санкцыі ў банку ніхто ня чуў, праца ідзе ў звычайным рэжыме. Мо Тозік дэзынфармаваў прэзыдэнта? Ці нехта закінуў «дэзу» самому Тозіку?**

Старонка 4.

# Агенты дзьвюх выведак

**Беларускі КДБ займаецца вэрбоўкай нацыяналістаў. Гомельскі зубровец Андрэй Зайцаў скончыў жыцьцё самагубствам, пакінуўшы заяву пра шантаж з боку спэцслужбаў. Гэтая трагедыя толькі пацьвердзіла тое, што для многіх было сакрэтам Полішынэля. У шэрагах апазыцыі ёсьць «засланыя казачкі» і інфарматары. Калі Славаміру Адамовічу і Алесю Емяльянаву ў 1991 г. хапіла мужнасьці расказаць пра сваю вымушаную супрацу з «органамі», здавалася, на гэтай тэме можна ставіць кропку. Аказалася, заўчасна. Гісторыя вэрбоўкі нацыяналістаў савецкаю спэцслужбай — у артыкуле Сяргея Ярша.**



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

1921 год. Актор маскоўскага тэатру «Буф» **Герман Шыманюк** вяртаецца з бальшавіцкай Расеі на родную Бельшчыну. У пачатку 1920-х, пасьля таго як «пасеклі край наш папалам», у Заходняй Беларусі ўсчалася антыпольская партызанская вайна, якой кіраваў з-за мяжы Ўрад БНР. За год Шыманюк робіцца вядомым на ўсю Белавескую пушчу партызанскім атаманам, узяўшы (відаць, у памяць пра сцэнічную дзейнасьць) псэўданім «Скамарох».

У сакавіку 1922-га ён настолькі набраўся нахабства, што накіраваў Язэпу Пілсудзкаму ўльтыматум. Пагражаў жудаснымі тэрактамі, калі палякі ня выведуць сваіх войскаў зь беларускай зямлі. Замест гэтага палякі ўвялі войскі ў Белавескую пушчу і зьнішчылі Скамарохаў атрад.

Але атамана злавіць ня здолелі. Ён нібы растаў у паветры. Толькі дзякуючы архіўнай знаходцы Віталя Скалабана стала вядома: Скамарох празь Літву ўцёк у Менск, дзе пад прозьвішчам Паплаўскі дажыў прынамсі да 1937-га. Ён ад пачатку быў агентам ВЧК. Пытаньне аб прыёме «тав. Паплаўскага» ў камуністычную партыю вырашалі ў сакавіку 1925-га аж на Бюро ЦК КП(б)Б... Але нядоўга музыка іграла: у 1935 г. Шыманюка арыштавалі. Седзячы на Валадарцы, ён піша 4 ліпеня 1937-га ліст сакратару ЦК КП(б)Б Шаранговічу, у якім прызнаецца, што партызаніў па заданьні савецкай рэзыдэнтуры ў Коўне. Сваю дзейнасьць у Менску былы атаман характарызуе так: «Кіраўніцтва ОГПУ з 1923 да 1934 г. ведала нас як самых нястомных чэкістаў». Наколькі праўдзівыя былі яго прызнаньні, сказаць цяжка. Справы Скамароха ў архіве КДБ не знайшлося.

«Маючы такіх атаманаў і міністраў, ні на пачатку, ні ў канцы XX ст. немагчыма было збудаваць ні дзяржавы, ні народу», — катэгарычна пісаў у сакавіку на старонках беластоцкай «Нівы» гісторык Яўген Мірановіч. Часьцяком сустракаюцца згадкі пра супрацу з савецкімі спэцслужбамі ў мэмуарах беларускіх дзеячоў. Але справа гэтая занадта тонкая, каб часаць усіх адным грэбенем.

Нехта, як **Баляслаў Грабінскі** (яго ўспаміны друкаваліся ў часопісе «ARCHE») ці апошні прэзыдэнт БЦР **Міхась Зуй** (яго прызнаньне было надрукаванае ў кнізе «Вяртаньне БНП»), завэрбаваныя НКУС праз шантаж і пагрозы, імкнуліся нікому не нашкодзіць.

Інакш паводзіўся лейтэнант батальёну «Дальвіц» **Алег Стахоўскі**, што спачатку здаў «Сьмершу» сваіх саслужбоўцаў, а ў 1947 г. — шчырую моладзь з падпольнага «Саюзу беларускіх патрыётаў» у Глыбокім і Паставах. Па першым эпізодзе Стахоўскі прызнаўся сам на старонках «Гродненской правды» 21, 27 траўня і 2 чэрвеня 1967-га, пра другі сьведчыць кніга ўспамінаў «Гарт». Ён падбухторваў юнакоў на збройныя акцыі супраць савецкай улады, каб яны атрымалі прысуды як мага больш жорсткія. Пасьля Стахоўскі пераехаў на Гарадзеншчыну, працаваў у Івейскім раёне загадчыкам сельпо. Пазьней, казалі, зрабіўся праваслаўным сьвятаром: ці то замольваў грахі, ці то асвойваў новы адказны ўчастак юдавай работы.

Але такіх было мала. У большасьці выпадкаў асалоды ад гэтае «працы» людзі не адчувалі — яны ратавалі сябе і сваіх крэўных ды імкнуліся выбавіцца зь нерату ГПУ.

Працяг на старонцы 7.

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Уратуем вёску — краіна будзе жыць

Свой жнівеньскі тыднёвы адпачынак прабыў зь дзецьмі ў бабчынай вёсцы. За адсутнасьцю альтэрнатывы глядзеў штовечара «Панараму». І аднойчы пабачыў у ёй геніяльны рэпартаж з жніва. Гаворка вялася пра дапамогу перадавых шчучынскіх камбайнёраў калгасам Астравеччыны. Адзін з герояў рэпартажу, малады дыплямаваны доктар, прыехаў на час адпачынку ў родную вёску, каб папрацаваць на камбайне. Гэта ня хобі, хоць праца ў полі лекару даспадобы. Ён прыехаў, «каб падзарабіць».

АТН паставіла ў эфір гэтую тэлепастараль са сьвяточна апранутымі пэйзанамі — і не падумала, які артроз сыстэмы агаляе. Глядзіце, як добра плацяць працаўнікам вёскі — людзі з гораду прыяжджаюць сюды зарабіць. Захапляйцеся, як арганізавана дапамагаюць гаспадаркам паўночных раёнаў вобласьці.

Малады доктар атрымлівае столькі, што мусіць парабкаваць камбайнёрам на адпачынку. Раўняйцеся, Польшча і Галяндыя. А справы ў калгасах перадавой Шчучыншчыны такія добрыя, што на жніво наймаюць гараджэ. Сваіх няма каго. А што ж тады робіцца ў Хоцімску?

«Уратуем вёску — краіна будзе жыць. Ня зробім гэтага — цяжка нам будзе», — з году ў год паўтарае нам з тэлеэкранаў правадыр, як толькі надыходзяць гарачыя дні паншчыны. А пачак масла як каштаваў у вясковай краме на 200 рублёў даражэй, чым у гарадзкой, так і каштуе.

Сыстэма хацела б такіх «спакойных крокаў па разьвіцьці прыватнай уласнасьці» ў вёсцы, каб пры гэтым прыгону не скасоўваць. Не ўдаецца праз калгасы — аддадуць калгасьнікаў у найміты прадпрымальнікам (пра новыя рэформы на вёсцы цікава піша Дамінік Міхайловіч на старонцы 4). Але ўсе дагэтулешнія рэформы не касуюць сутнасьці прыгону — прымусовага абмену і цэнтралізаванага пераразьмеркаваньня сродкаў між вёскай і горадам. Сяло век прадае прадукцыю за бясцэнак, гарue без інвэстыцый і век цалуе панскую ручку, якая шчодра вяртае 20% дзяржбюджэту яму ж, але ўжо ў якасьці датацый, якія можна атрымаць, а можна і не атрымаць. Прымусам ці дажынкамі, матам ці пахвалою, але вёску, як і ўсю краіну з дактарамі, трактарыстамі і бюджэтнікамі разам, трымаюць у стане поўнага бясправ'я, залежнасьці ад улады, а ўрэшце — беспэрспэктыўнасьці. Калі толькі піць і красьці й застаецца, што б ні шчабяталі «панарамныя» салоўкі.

Убачыў я на маццярыншчыне яшчэ адно дзіва. У адной прылеснай вёсцы, зь «беспэрспэктыўных», пры дарозе на пэрыфэрыйны памежпераход збудаваў дзядзька гасьціны двор з харчэўняй і гаражамі. І дрэмле гэтая карчма з чырвонае цэглы пры дарозе, замкнёныя яе весьніцы. Зачынілі. Ведама, што на просьбу суседзяў, аднавяскоўцаў, як гэта ў нас робіцца, бо шмат шуму было ад яе наведнікаў...

Абы засявалі ўсё — няважна, якім коштам. Абы ня сталі некіраванымі. Не спрачаюся — добра, што зямля ў нас не ляжыць аблогам. Але не такім спосабам, як цяпер, гэта павінна дасягацца, не такім.

**Андрэй Дынько**

## Што сказаў Буш

**Што так напалохала ўлады ў дзейнасьці Яна Буша,** выкінутага з краіны нямецкага сацыял-дэмакрата, які абменьваўся досьведам палітычнае дзейнасьці зь беларускімі палітыкамі? У паведамленьнях БТ гэта прагучала адназначна: ён «заклікаў удзельнікаў мерапрыемстваў да кансалідацыі ў мэтах процідзеяньня кіраўніцтву Беларусі». Перакладаючы на людзкую мову: апазыцыя тады стане сілаю, калі будзе адзінаю, от на што бунтаваў народ Буш.

**Барыс Тумар**

## Падпісаў воўк кабылу

**Пры падпісаньні закону аб масавых мерапрыемствах Аляксандар Лукашэнка выключыў зь яго шраг палажэньняў.** Аднак ня тых, якія выклікалі шквал пратэстаў праваабаронцаў у Беларусі і за яе межамі, а, наадварот, тых, што дапускалі тэарэтычную магчымасьць лібэральнае інтэрпрэтацыі акту.

Прэзыдэнт выразаў з прынятага дэпутатамі дакумэнту палажэньні аб тым, што закон не пашыраецца на рэлігійныя мерапрыемствы, а таксама сустрэчы з выбарцамі і сходы з удзелам дэпутатаў. З закону таксама выключаная норма, што дазваляла выканаўчым органам «у выпадку ўзьнікненьня экстраннай неабходнасьці» даваць дазвол на правядзеньне масавага мерапрыемства раней устаноўленага тэрміну (15 дзён). Выключаная й норма, што абавязвала суды разглядаць скаргі на парушэньні закону цягам трох дзён.

**Мікола Бугай**

# Герой працы Быкаў

Гарадзенскія ўлады прынялі нечаканае рашэньне — увекавечыць памяць Васіля Быкава, які пражыў у Горадні 24 гады і стаў тут сусьветна вядомым пісьменьнікам. Нечаканасьць гэтая прыемная. Другая рэч хутчэй чаканая, але непрыемная. Я маю на ўвазе тэкст. На дошцы напішуць, што быў ён героем сацыялістычнай працы і ляўрэатам ленінскай і дзяржаўнай прэміі. Праўда, такое рашэньне гарвыканкаму павінен яшчэ ўхваліць аблвыканкам.

Што было, тое было, скажуць мне. Правільна было, адкажу я. Бо пасьля гэтай усёй леніняны колькі рознага адбылося! Сёньня 2003 год, а тэкст прыдумалі 20-гадовай даўнасьці. Казённы савецкі тэкст. Вядома, улады не такія дурныя. Яны, што відавочна, — падстрахаваліся! Вядомае ж стаўленьне «бацькі» да Народнага пісьменьніка. Дык лепей, маўляў, такую шыльду, чым ніякую. Адвечная спрэчка. Што лепей: што Каліноўскага і Багдановіча ў Горадні ў больш-менш дэмакратычныя часы не паставілі й іх дагэтуль няма і невядома калі будуць? ці хай бы паставілі тых, выкананых у савецкай традыцыі, і яны б добрых дзесяць гадоў фармавалі аблічча Старога гораду? Я згодны зь першымі, але мне сумна так доўга жыць у горадзе безь беларускіх помнікаў.

Элементарны людзкі крок — уявіць, а ці спадабалася б гэткая мэмарыяльная шыльда самому Быкаву? Я пераканаңы: ён быў бы супраць! А значыцца, ня можа быць мовы пра падобны тэкст. Калі сёньня з гонарам афіцыйныя рупары паведамляюць пра актора ці сьпевака, што ён — дагэтуль жа «народны арціст СССР», дык Васіля Быкава гэта не датычыць. Я б напісаў больш па-людзку, што Васіль Быкаў — сусьветна вядомы пісьменьнік, што свае самыя вядомыя кнігі ён напісаў менавіта ў гэтым горадзе, дзе жыў і працаваў, у горадзе, які яго натхняў. А што да прэмій, дык для пісьменьніка маюць значэньне толькі сапраўдныя, 100-працэнтна літаратурныя. Напрыклад, Нобэлеўская.

**Сяргей Астравец, Горадня**

## Акадэмік Вайтовіч:
# «Гэта даўняя практыка»

**15 жніўня ў афіцыйным друку зьявілася пастанова Акадэміі навук №37, датаваная аж 17 красавіка.**

Яна рэглямэнтуе прызначэньне даплатаў акадэмікам і сябрам-карэспандэнтам НАНБ за акадэмічныя навуковыя званьні паводле вынікаў працы ў 2002 г. Дакумэнт, падпісаны Міхаілам Мясьніковічам, у ліку нямногіх іншых пазбаўляе «акадэмічных надбавак» навукоўцаў, якія сёньня больш вядомыя сваёй палітычнай дзейнасьцю, — акадэміка Аляксандра Вайтовіча і чальца-карэспандэнта Станіслава Шушкевіча. Першаму зьнялі надбаўкі за тое, што ягоным асноўным месцам працы «ня ёсьць установы й арганізацыі навукі, адукацыі, культуры і аховы здароўя». Другому — за тое, што не падаў навуковай справаздачы.

Абодва акадэмікі адрэагавалі на пастанову спакойна. С.Шушкевіч зазначыў, што нават ня чуў быў пра існаваньне гэткага дакумэнту: «Мяне хочуць пазбавіць гэтых надбавак з 1999-га. Гэта пачалося яшчэ пры Вайтовічу, які тады быў прэзыдэнтам Акадэміі навук. Хай пазбаўляюць — я й цяпер друкуюся ў прэстыжных навуковых часопісах (у тым ліку замежных) і выступаю на міжнародных навуковых канфэрэнцыях больш, чым многія акадэмікі. А справаздача... Я сыпярша пісаў іх, а потым падумаў: чаму я павінен пісаць справаздачу Мясьніковічу?»

Акадэмік Аляксандар Вайтовіч ставіцца да пастановы НАНБ як да шараговага дакумэнту: «Гэта даўняя практыка: уж даўно выйшаў Указ прэзыдэнта, паводле якога навукоўцам, што не працуюць ва ўстановах навукі й адукацыі, ня плацяць надбавак ні за званьне акадэміка, ні, здаецца, нават доктара навук. Кандыдатуры разглядаюцца штогод, і ў сёлетнім факце няма нічога надзвычайнага». Сам экс-сьпікер савету рэспублікі цяпер мяркуе вярнуцца ў навуку і, паводле ўласнага прызнаньня, мае пэўныя прапановы.

І ўсё ж ёсьць палітычны падтэкст у запозьненым друкаваньні звычайнай пастановы Акадэміі навук на другой паласе «Саўбеліі»: каб іншыя Вайтовічы баяліся.

**АШ**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**На фота: Генадзь Навіцкі і Аляксандар Вайтовіч (справа): «Дарыце ружы, дарыце ружы...»**

## Ідэолягі вынаходзяць ровар

Сёньняшніх ідэалягізатараў мне шчыра шкада. Гледзячы ў навінах на іхныя спатнелыя, разгубленыя твары, пачынаеш міжволі суперажываць. На мінулай урадавай нарадзе па ўдасканаленьні ідэалягічнай работы прэзыдэнт, іхнае сонца, абаронца і мудры дарадца, пакінуў іх адных у шчырым зьдзіўленьні. Нам патрэбная ідэалёгія, казаў ён паўгоду таму. Ідэалёгію дарма ўсе ганьбілі! — падхапілі яны, заднім розумам мяркуючы, каму з родных, блізкіх і знаёмых падкінуць ізноўку модную пасаду. Ідэалёгіяй нам трэба ахапіць народ, заківала ніжэйшае чынавенства, мяркуючы тым жа месцам пра тое ж. Але якой? На гэтае пытаньне адказу пакуль ніхто не прыдумаў, але нашто было асабліва старацца, калі, здаецца, савецкая была «очень дажэ»?

І вось цяпер, калі ў найлепшых традыцыях савецкіх урадоўцы сабраліся прачытаць з паперак адзін аднаму аб тым, што «ідэя стварэньня ідэалягічнай вэртыкалі ўсё больш і больш апраўдвае сябе», прэзыдэнт абрынуў сваё неспадзяванае «не». Вэртыкалі яму ня трэба, ня трэба прафэсійных ідэалягізатараў на прадпрыемствах, — ён наагул задаў прысутным парадаксальнае пытаньне зь непрыхаваным папрокам: чаму вы лічыце, што шлях, абраны намі, верны? І гэта ён пра ўласнаручна створаную «беларускую мадэль»!

Шкада чыноўнікаў, што сядзелі, апусьціўшы вочы, нэрвова разважаючы, чаго ад іх хоча галоўны начальнік. Як заўжды, яны меркавалі пад новым соўсам падаць страву з тэрмінам прыдатнасьці 1918—90. Вось жа і назва-лёзунг іхнай любімай газэты нам сьведчыць, што Беларусь сёньня — гэта Савецкая Беларусія.

Ён кажа: ня трэба нам ідэалягічнай вертыкалі, бо ідэолягам мусіць быць кожны чыноўнік. А цяпер хіба ня так? Ці, можа, ён хоча, каб міністры самі выступалі на заводах, будоўлях і ў калгасах? Калі так, то мне іх зноў шкада.

І шкада студэнтаў, якія ўжо з 1 верасьня пачнуць вывучаць нікому пакуль невядомыя асновы беларускай ідэалёгіі — курс, падручнік пад які зьявіцца хіба ўзімку. Шкада выкладчыкаў, якім прыйдзецца пунсавець перад аўдыторыяй, дыктуючы пад насьмешлівыя позіркі пра наша сьветлае жыцьцё. І выдумляць новыя навуковыя паняткі, кшталту «якасьць жыцьця» ці «беларуская эканамічная мадэль».

Шкада нават прэзыдэнта, бо ў яго атачэньні ніяк не знаходзіцца чалавек, які б растлумачыў, што тое, чаго ўсе шукаюць пад маркай «ідэалёгіі», даўно ўжо існуе і называецца нацыянальнай ідэяй. Або што «імунная сыстэма дзяржавы» — гэта не набор лёзунгаў, а свабодная прэса і палітычная апазыцыя. Але гэта ў нармальных грамадзтвах.

**Аляксей Бацюкоў**

# Умова мовы

Сёньняшняй дзяржаўнай сыстэме ўласьцівы парадокс: чым больш размоваў пра незалежнасьць, тым менш на тэлевізіі, радыё, у школе беларускае мовы. Усе навіны БТ й палова «Панарамы» (відаць, у выніку канкурэнцыі з АНТ) — ужо па-расейску. «Настасься Слуцкая» — па-расейску. Міністры адукацыі й культуры — і то па-расейску.

У эканоміцы ўлада пасьлядоўна выконвае ўсё, што казаў Пазьняк дзесяць гадоў таму. У палітыцы імпэрскія памкненьні Крамля выкрываюцца афіцыёзам на кожным кроку. Але што да сымболікі й мовы — ані!

Ці магчымае поўнае перараджэньне рэжыму?

Як казаў калісьці найбуйнейшы адмысловец у справе пераўвасабленьняў Павал Якубовіч, беларуская мова для яе носьбітаў — сыстэма апазнаваньня «свой—чужы»: гаворыш па-беларуску — «наш», па-расейску (хто б ты ні быў) — «іншы». Такім чынам, мы зноў прагз дзесяцігодзьдзе вяртаемся да пытаньня мовы. Колькі б ні спрабавалі ці ўладныя, ці апазыцыйныя прагматыкі сьпісаць «моўную праблему» ў архіў — яна ўсё гэтак жа будзе выконваць ролю псыхалягічнае мяжы. Яе будзе балюча пераадольваць, яна будзе зноў расколваць апазыцыю, на ёй зноўку будзе гуляць Масква, а ў масавай сьвядомасьці менавіта яна стане знакам рэальнае незалежнасьці. Беларусі рана ці позна давядзецца пераходзіць на беларускую — спрачацца можна адно наконт мэтадаў.

Тэарэтычна беларусізацыя магчымая й цяпер. Нягледзячы на страты апошніх гадоў, мова захавала стратэгічны патэнцыял аднаўленьня. Гэта і больш за 40% беларусаў, якія пазначылі, што гутарць дома па-беларуску (няхай гэта больш жаданьне, чым рэчаіснасьць, — жаданьне паказальнае!), і 85,6% тых, хто назваў яе роднай. Гэта і беларускамоўная моладзь у сталіцы й буйных гарадох, прычым пераважна ў актыўных грамадзкіх і творчых асяродках. Гэта і элітарнасьць: мова ўспрымаецца як аналяг культурнасьці й інтэлігентнасьці («беларускамоўны — значыць, пісьменьнік, настаўнік або палітык»). Праўда, праблемамі мовы цяпер сур'ёзна займаецца хіба ТБМ — у астатніх чамусьці мову адняло. Вось тут бы і пераняць ініцыятыву...

Але!

Загаварыўшы па-беларуску, Лукашэнка ўмомант робіцца «чужым» для свайго электарату. Больш таго — ён робіцца «іншым» і для патэнцыйнага расейскага выбарца, на якога разьлічаны ўвесь гэты саўковы піяр пра «рускага чалавека», які штораз вывальваецца перад маскоўскімі тэлекамэрамі. Таму ў арсэнале намэнклятуры мова прадугледжваецца толькі ў выглядзе разавых прамоваў (дзе-небудзь у Нясьвіжы ці Маладэчне) і толькі як прынада для «нацыяналістаў».

У траўні 1995-га, вызначыўшы беларускую мову як мяжу, рэжым загнаў сябе ў кут. Адсюль і марнасьць пошукаў «белорусской идеи» — ужо год як вынаходзяць папараць-кветку. З расейскамоўнае гаварыльні ці пісаніны беларуская нацыянальная ідэя ня можа нарадзіцца ў прынцыпе — бо гэтая ідэя дадзеная нам Богам у камплекце з ключом унікальнае мовы. Беларускасьць зь яе культурай кнігі, ускалыханая ў міжмоўі Захаду й Усходу, можа быць расшыфраваная толькі праз Слова.

Таму, калі мы прыйдзем да ўлады, сярод прафэсійных патрабаваньняў для чыноўнікаў абавязкова будзе і гэтае. Умова мовы.

**Павал Севярынец**



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**12 жніўня перад брамай ліцэю адбылася прэзэнтацыя кнігі юбіляра Ўладзімера Арлова «Адкусі галаву вароне». З імправізаванай сцэны — хісткага крэсла выступае Валянцін Акудовіч (на здымку)**

# Выкладчыкі пайшлі ў дарэктары

Увечары 6 жніўня ліцэйскі дворык быў ачэплены міліцыяй і АМАПам, у будынак не пускалі. На наступны дзень увайсьці туды ня здолелі ня толькі ліцэісты і іхныя бацькі, але і многія выкладчыкі: міліцыянты спасылаліся на таямнічы сьпіс, паводле якога прапускалі толькі «абраных». Складаў яго галоўны інжынэр гараддзелу адукацыі. Сьпіс дзівіў бязглуздасьцю. Ён не даваў права ўвайсьці ў будынак нават намесьніку дырэктара Лявону Баршчэўскаму: «Я кажу: у мяне права подпісу, мне трэба падпісваць дакументы на аплату за сьвятло. А чыноўнікі адказваюць: гэта няправільна, што ў вас права подпісу, няхай яно будзе ў каго-небудзь іншага». Уладзімер Колас сам адмовіўся ўваходзіць у ліцэй на знак пратэсту. Ад гэтага часу пачалася вахта бацькоў і навучэнцаў каля будынку.

Забарона на ўваход тычылася й «нячэсных» журналістаў. Затое міліцэйскі эскорт і ўсялякае спрыяньне з боку ахоўнікаў парадку мела карэспандэнтка «Советской Белоруссии». У ліцэй маглі бесьперашкодна трапляць рабочыя, якія прыйшлі рабіць «рамонт».

Бацькі ліцэістаў зьвярнуліся ў Дэпартамэнт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, каб абараніць будынак ад псэўдарамонту. Падтрымалі іх і спэцыялісты зь «Белжылпраекту», якія лічаць, што навучальны год у ліцэі можна пачынаць і без капрамонту.

Дырэктар Дэпартамэнту Васіль Абламскі з разуменьнем паставіўся да звароту бацькоў: прызначыў навуковым кіраўніком аб'екту Ларысу Панамарову ды загадаў камітэту адукацыі тэрмінова спыніць на гісторыка-культурнай каштоўнасьці рамонт, ня ўзгоднены з спэцыялістамі. Будаўнікі пасьпелі толькі абабіць тынкоўку на двух мурах трысьцену-ўваходу і высадзіць шыбы ў іх. Ад 8 жніўня гэты «рамонт» спыніўся.

Новы тыдзень прынёс новыя падзеі. У аўторак 12 жніўня проста на ходніку перад брамай ліцэю адбылася прэзэнтацыя кнігі Ўладзімера Арлова «Адкусі галаву вароне». З імправізаванай сцэны — хісткага крэсла выступалі празаік, ягоныя госьці: Зьміцер Бартосік, Адам Глёбус, Андрэй Хадановіч…

Натхнёныя падтрымкай з боку пісьменьнікаў і бардаў, бацькі разам зь дзецьмі прыйшлі 13 жніўня ў гараддзел адукацыі, куды былі запрошаныя чыноўнікамі. Аднак усярэдзіну іх не пусьцілі: інспэктар службы «Ахова» Кастрычніцкага РУУС перагарадзіў праход па лесьвіцы і адпіхваў тых, хто намагаўся прайсьці. Ды так, што ліцэістка Кацярына Савіцкая атрымала расьцяжэньне зьвязак на назе. (Бацькі падалі скаргу ў пракуратуру на неправамоцныя дзеяньні ахоўніка.)

- 1 верасьня пяць партыяў — працавікі, БСДГ, БНФ, ПКБ і АГП — ладзяць акцыю салідарнасьці зь ліцэістамі: «Ланцуг неабыякавых людзей».

Тым часам да будынку пад'ехалі міліцыянты з аўтаматамі. Разганяць і затрымліваць бацькоў яны ня сталі: чакалі, пакуль скончацца перамовы Л.Баршчэўскага з начальнікам упраўленьня адукацыі Аляксеем Воранавым. «Мне аднаназначна заявілі, што ніводзін зь цяперашніх выкладчыкаў ліцэю ў новай установе працаваць ня будзе. Акрамя таго, дзеця ня змогуць забясьпечыць навучаньне паводле ліцэйскіх праграмаў… З другога боку, сп.Воранаў запэўніў, што ніякіх перашкодаў у стварэньні недзяржаўнага ліцэю гарадзкія ўлады рабіць ня будуць», — падсумаваў Л.Баршчэўскі.

Аднак працэс стварэньня ліцэю — справа доўгая, дый не ад А.Воранава яна залежыць: атрыманьне атэстацыі й ліцэнзіі новай навучальнай установай вырашаецца на больш высокім узроўні. А пакуль ліцэісты будуць вучыцца самастойна — новы «Закон аб адукацыі» гэта дазваляе. «Хатнія заняткі» зь імі пагадзіліся праводзіць усе цяперашнія ліцэйскія выкладчыкі, прапануюць сваю дапамогу іншыя адмыслоўцы. Прыкладам, былы пасол у Нямеччыне прафэсар Пятро Садоўскі зьбіраецца выкладаць ліцэістам нямецкую мову. Згоду вучыць сваіх дзяцей у «дарэктараў» далі ўжо больш за 120 сем'яў.

Працягваюцца й акцыі пратэсту. 16 жніўня ў Цэнтральным дзіцячым парку і парку Чалюскінцаў ліцэісты пісалі на ходніках лёзунгі, раздавалі малечы, якая гуляла ў парках, рознакаляровыя балёнікі ды зьбіралі подпісы ў абарону ліцэю. Адміністрацыя і міліцыя пагражалі дзецям затрыманьнямі, але нікога не пахапалі.

19 жніўня акцыя «Я люблю ліцэй», як і на пачатку лета, прайшла на праспэкце Скарыны. Паўгадзіны стаялі навучэнцы зь лёзунгамі «Беларускім дзецям — беларускі ліцэй», «Я люблю ліцэй» ды інш., сьпявалі гімн ліцэю, «Простыя рэчы» з «Народнага альбому», NRM-аўскія «Трох чарапахаў», зьбіралі подпісы мінакоў. Агулам тых подпісаў ужо больш за 7000.

Увечары 19 жніўня адбыўся чарговы канцэрт пад сьценамі Ліцэю з удзелам Уладзімера Някляева і Тодара Кашкурэвіча. Гэта не апошняя сустрэча творчае інтэлігенцыі з абаронцамі ліцэю: на 26 жніўня запланаваная паэтычна-бардаўская вечарына з удзелам Віктара Шалкевіча. Пачатак а 18-й. На 24 жніўня запланаваны футбольны турнір (гл. старонку 12).

Працягваецца і вахта каля ліцэю. Штодня з 9.00 да 19.00 тут можна атрымаць сьвежую інфармацыю пра падзеі, падпісацца пад зваротам у абарону навучальнай установы. А яшчэ ліцэісты вельмі просяць усіх, хто зможа, дапамагчы ім: цэлы дзень стаяць на вахце цяжка, таму варта прыносіць з сабой прадукты, напоі, паперу (на ёй друкуюцца блянкі для збору подпісаў і г.д.), каляровую крэйду. Тутсама можна перадаць падручнікі, неабходныя для далейшага навучаньня, сшыткі, мапы, грошы.

**Аркадзь Шанскі**

## Зварот ліцэістаў

Камітэт абароны Ліцэю прыняў зварот да суайчыньнікаў і беларусаў замежжа. «Мы вымушаны пералічыць усіх, хто проста ці ўскосна прыклаў руку да руйнаваньня Ліцэю, з чыёй маўклівай згоды ці чыімі намаганьнямі вядзецца вайна зь Ліцэем. Гэта міліцыя і АМОН: Вараб'ёў, Падабед; гарадзкія ўлады: Турко, Воранаў, Ціцянкоў, Паўлаў; чыноўнікі Міністэрства адукацыі: Шчарбачэвіч, Шчэрба, Фарына, Жук, Брыгадзін; супрацоўнікі Савету Міністраў і Адміністрацыі прэзыдэнта: Навіцкі, Сідорскі, Праляскоўскі, Латыпаў; Лукашэнка.

Барацьба за Ліцэй — гэта барацьба за Беларусь. Нам патрэбная ваша падтрымка, падтрымка кожнага з вас. Вы можаце прыйсьці і паставіць ці даслаць свой подпіс у абарону НДГЛ. Вы можаце расказаць пра гэтую праблему сваім родным і знаёмым. Нарэшце, можаце стаць побач з намі», — гаворыцца ў звароце.

# Час цемрашалаў

«Трэба... ударыць як належыць, ударыць так, каб у сяго-таго пер'е пасыпалася...» У гэтых словах — ці не квінтэсэнцыя бальшавіцкіх адносінаў да інтэлігенцыі. І прамоўленыя яны ў лютым 1929 г. кіраўніком прафсаюзу работнікаў асьветы Антонам Платуном. Гэта за наркамам Платуном пусьцяць пад нож кнігу Янкі Купалы «1918—1928. Творы», забароняць друкаваньне купалаўскага перакладу «Эроса і Псыхі» Ежы Жулаўскага і ўчыняць вакханалію з нагоды выхаду ў сьвет VI тому Збору твораў генія беларускага слова...

Антона Платуна, якому падначальваліся і навучальныя ўстановы, і цэнзура, і тэатры з музэямі (тады наркамат асьветы «вёў» і культуру), я згадваю ў сувязі з адстаўкаю міністраў асьветы ды інфармацыі Пятра Брыгадзіна і Міхаіла Падгайнага. Як і Платун, гэтыя дзяржаўныя мужы грунтоўна насьлядзілі ў гісторыі Беларусі.

Нашы сэнтымэнталісты гатовыя былі праліць сьлязіну з тае прычыны, што сп.Брыгадзін сам напісаў заяву пра адстаўку: ах, якая мужнасьць, прынцыповасьць!.. Мы ж не забываем, што экс-міністар — гісторык і мусіў ведаць, з кім сядае за стол. Хоць ён імкнуўся не пакідаць сваіх подпісаў пад «гістарычнымі» дакумэнтамі, сп.Брыгадзіну належыцца прэмія імя пана Вэнслаўскага, віленскага акруговага школьнага інспэктара, і імя пана Вазьнякоўскага, школьнага інспэктара Гарадзенскага павету, якія ў 1919—20 г. зьнішчалі беларускія школы, у тым ліку беларускую гімназію ў м.Будславе Вялейскага павету (думаю, яе можна прыраўнаваць да ліцэю імя Якуба Коласа). А калі сп.Брыгадзіну крыўднае параўнаньне із згаданымі панамі (ня той узровень), вылучым яго кандыдатуру на атрыманьне прэміі імя міністра Скульскага, які абяцаў за 50 гадоў апалячыць Заходнюю Беларусь, або міністра Міклашэўскага, або віцэ-прэм'ера Тугута ці прэм'ера Грабскага... Вельмі знакамітыя ворагі беларускага школьніцтва, але да закрыцьця беларускіх гімназіяў яшчэ не дасьпелі.

Сп.Падгайнаму належыцца прэмія імя якога-небудзь камісара польскага ўраду на горад Вільню: тыя таксама ўмелі перасьледаваць беларускі друк.

За Польшчаю ў турмах сядзелі рэдактары Мікола Шыла, Антон Войцік, Антон Луцкевіч... Імя дагэтуль мала каму вядомага былога камсамольскага сакратара Падгайнага будзе фігураваць у гісторыі беларускае журналістыкі ў сувязі з судамі над журналістамі Міколам Маркевічам, Паўлам Мажэйкам ды Віктарам Івашкевічам. Упісаў ён сваю старонку і ў гісторыю беларускае літаратуры. Мусіць, эпохаю Падгайнага назавуць будучыя дасьледчыкі час, калі была створаная знакамітая ўстанова «Літаратура і мастацтва» (шкада, што ёй не прысвоілі імя былога міністра) і зьявіўся ня менш знакаміты «сьпіс Скобелева». Імя сп.Падгайнага будзе згадвацца і ў сувязі з закрыцьцём шэрагу выдавецтваў...

Сп.Брыгадзін і Падгайны зрабілі сваю справу. Сп.Брыгадзін і Падгайны могуць ісьці. Настаў час іншых выканаўцаў высокіх загадаў. Цемрашалы працягваюць наступ.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Хто «замовіў» РРБ-банк?

Працяг са старонкі 1.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сума, якая фігуруе ў лісьце старшыні Камітэту дзяржкантролю, сьведчыць толькі аб адным: банк некаму «не падабаецца» і нехта хоча яго сьмерці. Бо сума гэтая ў пераліку на даляры складае амаль тры з паловай мільёны. Гэтыя грошы — па сутнасьці, «РРБ-банк» цалкам з усёй сваёй «гаспадаркай»: статутным фондам, актывамі, нерухомасьцю й пэрсаналам. Іншая справа, што Тозік інфармаваў прэзыдэнта на падставе лічбаў, атрыманых з падатковай інспэкцыі. Яна налічыла банку «эканамічныя санкцыі найвышэйшай нацэначнай катэгорыі» за «незабесьпячэньне неабходнага кантролю за выкананьнем усталяванага парадку звароту вэксаляў».

Між іншым, ЗАТ «Банк рэканвэрсіі й разьвіцьця РРБ-банк» — невялікі нават у беларускіх мерках. Ён быў утвораны 10 гадоў таму й паступова заняў сваё пачэснае месца ў сярэдзіне банкаўскай «турнірнай табліцы». Дзесьці два гады таму банк больш актыўна пачаў працаваць з вэксалямі, прычым адмысловцы кажуць, што ягоныя схемы працы нічым ня розьніліся ад тых, зь якімі працуюць у іншых банках. У «РРБ-банку» абвяргаюць інфармацыю пра недавыплачаныя банкам падаткі, а таксама закід Тозіка пра «падложныя» дакумэнты, на аснове якіх, быццам бы, ажыцьцяўляліся ў банку ўсе апэрацыі з вэксалямі. Больш за тое, два месяцы таму на патрабаваньне Асацыяцыі беларускіх банкаў зь Дзяржаўнай падатковай інспэкцыі прыйшлі тлумачэньні наконт ажыцьцяўленьня апэрацыяў з вэксалямі. А калі па гэтай схеме насамрэч працуюць усе беларускія банкі, дык можна досыць апэратыўна падпрадвіць фінансавае становішча дзяржавы шляхам адначасовага штрафаваньня на мільярдныя сумы ўсіх банкаў краіны. Дарэчы, Тозік паінфармаваў прэзыдэнта, што такія ж парушэньні ёсьць і ў іншых банках, праверкі якіх мяркуецца ажыцьцявіць яшчэ сёлета.

Тым часам, паводле нашай інфармацыі, старшыню праўленьня «РРБ-банку» Андрэя Верацельнікава ўжо выклікалі і ў падатковую інспэкцыю, і ў КДК, дзе прапаноўвалі «чыстасардэчна» распавесьці пра парушэньні заканадаўства. Аднак банкір адказаў, што распавядаць няма чаго. Цяпер банк рыхтуе дакумэнты, каб падаць у суд на падатковую інспэкцыю і Камітэт, якія зьвінавацілі «РРБ» у працы з падложнымі дакумэнтамі.

Хто стаіць за гэтай гісторыяй? Мо нейкі канкурэнт хоча перацягнуць кліентаў «РРБ-банку» да сябе? Але беларускія банкі дагэтуль ніколі так сябе не паводзілі, і ніводзін зь іх не лічыў за добрае ваяваць з калегамі й пускаць іх па сьвеце. Але чаго раней не было, тое, можа, цяпер ужо ёсьць?

Доля «РРБ-банку» на фінансавым рынку не такая ўжо і вялікая, а на рынку каштоўных папераў месца дагэтуль хапала ўсім. Ці, можа, гэтая гісторыя — частка вялікага супрацьстаяньня сілавых ведамстваў — КДБ і КДК, а арганізатары выкіду інфармацыі маюць заплечча ў апошняй структуры? Ці гэта нават нейкі сымптом зьменаў у атачэньні прэзыдэнта і частка эліты нейкім чынам выкарыстоўвае (ці выкарыстоўвала) гэты банк у сваіх інтарэсах? Улічваючы тое, што эканоміка ў нашай краіне зьяўляецца часткай палітыкі, усё мажліва. Але мажліва й іншае — кагосьці папросту вырашылі «папужаць» і санкцый увогуле не ўжывуць. Зрэшты, гэта залежыць ад таго, як будзе паводзіць сябе як кіраўніцтва банку, так і тыя, хто за ім стаіць.

**Зьміцер Данскі**

БУДНІ СВАБОДНАЙ ПРЭСЫ

## Недзяржаўную газэту пазбавілі «Тытулу»

**18 жніўня сьветлагорская газэта «Регион-вести» атрымала з рэчыцкай друкарні «Тытул» ліст, у якім паведамляецца, што з 14 верасьня іх дамова аб супрацы касуецца.** Друкарня спасылаецца на вялікую загружанасьць у сувязі з «сэзоннай працай па выпуску каляндароў». Галоўны рэдактар газэты Мікалай Паседзька лічыць крок друкарні палітычным. Нядаўна «Регион-вести» павялічылі аб'ём і пачалі выходзіць у двух колерах. Рэдакцыя адмовілася дзеля гэтага ад паслуг друкарні ў Сьветлагорску і падпісала дамову з больш сучасным рэчыцкім прадпрыемствам, на якім пасьпела выпусьціць толькі тры нумары.

## Штраф «Салідарнасьці»

**Праверка Камітэту дзяржкантролю пачалася ў рэдакцыі «Салідарнасьці», пасьля таго як газэта надрукавала матэрыялы прыпыненай «Белорусской деловой газеты».** І вось вырак: выданьне пакаранае штрафам на 4 млн руб., бо «ў дадзеных выпуску не ўказаныя зьвесткі пра тэрмін заснаваньня газэты, а таксама памеры выданьня ў друкаваных аркушах». Рэдактар Аляксандар Старыкевіч дэманстраваў кантралёрам «Советскую Белоруссию», дзе таксама тых зьвестак няма. Не дапамагло.

## Дзень зачыненых газэтаў

**Беларуская асацыяцыя журналістаў ладзіць 14 верасьня, у Дзень міжнароднай салідарнасьці журналістаў, акцыю «Дзень зачыненых газэтаў».** У менскім гатэлі «Беларусь» адбудзецца вечарына з абмеркаваньнем праблемаў недзяржаўнае прэсы.

**СМ**

# Урад развальвае калгасы

**Калі так пойдзе далей, падмурак савецкай улады і сёньняшняга палітычнага рэжыму — калгасна-саўгасная сыстэма — будзе разбураны. Прычым зробяць гэта самі ўлады.**

Яшчэ ўвесну прэзыдэнт заявіў, што ня будзе больш субсыдыяваць стратныя сельгаспрадпрыемствы. А такіх каля 60% ад агульнае колькасьці. На апошняй нарадзе з удзелам прэзыдэнта і прадстаўнікоў розных міністэрстваў была агучаная ідэя ўвядзеньня прыватнаўласьніцкіх мэханізмаў у аграсэктар. Прэзыдэнт прапанаваў 450—500 калгасаў (а гэта 20% ад агульнай колькасьці) па ўсёй краіне аддаць найгоршым ворагам працоўнай клясы — прадпрымальнікам. Ждановіцкаму рынку, напрыклад!

Рэфармаваньне калгасаў ідзе ўжо даўно, але ўлады агучваюць гэта неахвотна: ня ведаюць яшчэ, ці ўдасца. У Лідзкім раёне не засталося ніводнага калгасу — цяпер гэта ўнітарныя прадпрыемствы, кожнае зь якіх узначальвае найманы мэнэджэр, а калгасьнікі ўжо не сябры кааператыву, як раней, а таксама найміты. Такія ж працэсы ідуць у некаторых іншых раёнах краіны, у тым ліку і ва ўсходняй Беларусі. Ходзяць чуткі, што на чарзе ўся Менская вобласьць!

Ёсьць і іншыя прыклады. У адным райцэнтры дырэктарам саўгасу ўзялі прадпрымальніка-каўказца, уладальніка сеткі харчовых крамаў у тым мястэчку. Землі саўгасу знаходзяцца ў межах мястэчка і вакол яго — там, дзе ў будучыні шмат хто пажадае ўзьвесьці катэдж.

Улада імкнецца захаваць сацыяльна-эканамічны статус-кво і адначасова рэфармаваць аграпрамысловы сэктар, які высмоктвае адных толькі наўпростых датацыяў на 10—12% кансалідаванага бюджэту штогод, ня кажучы ўжо пра «шэфскую» дапамогу прадпрыемстваў і трасфэрты ў выглядзе бясплатнага сена, як нядаўна практыкавалася ў Лельчыцкім раёне. Урад імкнецца скінуць зь сябе гэты цяжар на чые заўгодна плечы, хоць бы і прадпрымальнікаў: у каго ж яшчэ могуць быць грошы?

Што, аднак, адбудзецца, калі дзяржава сапраўды скароціць аб'ём датацыяў сельскай гаспадарцы? Калгасы і саўгасы даюць 60% агульнага аб'ёму вытворчасьці сельгаспрадукцыі, гаспадаркі людзей — астатнія 40%. Калі скараціць аб'ём субсыдыяваньня калгасаў, не пасеюць і не пажнуць ня толькі ў іх, але і ў прыватных гаспадарках, бо вытворчасьць там цалкам залежыць ад дармовых ці крадзеных у калгасе рэсурсаў. Спадзявацца на тое, што вёска перажыве скарачэньне дзяржаўнай падтрымкі, няма чаго.

Працэсы «рэфармаваньня» калгасна-саўгаснай сыстэмы ставяць пад пагрозу ня толькі самі калгасы і саўгасы, але і, з пункту гледжаньня харчовай бясьпекі, усё насельніцтва Беларусі. Бо тое, пра што гавораць улады, — гэта забраць у сельскай гаспадаркі сродкі існаваньня і ня даць ёй нічога наўзамен. Ніхто не спрачаецца: скарачаць датацыі сельскай гаспадарцы трэба. Але зрабіць гэта магчыма будзе толькі тады, калі ў яе зьявяцца ўласныя грошы. Без структурных рэформаў у сэктары (прыватызацыі зямлі і інш.) дасягнуць гэтага нельга. Усе паўрэформы і хістаньні ў баку толькі пагоршаць сытуацыю.

**Дамінік Міхайловіч**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Гарадзенцы выпіваюць піва ўдвая болей проці магілёўцаў

**Выраб піва ў Беларусі сёлета вырас проці мінулага году на 3,7%.** Істотна пабольшаў і экспарт, а вось унутранае спажываньне ўпала на 13,1%. Усяго сёлета за паўгодзьдзе прадалі па 5,69 л піва на чалавека (летась — 6,62 л). Спажываньне зьменшылася за кошт зьмяншэньня імпарту з Расеі. З рэгіёнаў самае высокае спажываньне піва — на Гарадзеншчыне, найменшае — на Магілёўшчыне. Над Нёманам за паўгодзьдзе прадалі 882,9 тыс. дал піва, над Дняпром — 472 тыс. дал.

## Атрымаем лібійскі крэдыт

**Лібійскі арабскі замежнагандлёвы банк выдасьць Беларусі пад гарантыі ўраду крэдыт у 120 млн эўра тэрмінам на 5 гадоў пад вельмі зручныя 3,5% гадавых.** Праект пагадненьня ўхвалены «на самым высокім узроўні», перадае агенцтва «Інтэрфакс». На думку экспэртаў, крэдыт будзе скіраваны на выплату запазычанасьці перад «Газпромам» (126 млн даляраў).

## Цэны на нерухомасьць узьляцелі

**Сярэдняя цана квадратнага мэтра жытла ў сталіцы за апошні квартал вырасла на 20,9 даляра і дасягнула рэкорднага ўзроўню ў 448 даляраў (падлік Менскага таварыства аценшчыкаў).** Экспэрты разыходзяцца ў тлумачэньні прычынаў гэтага ўзьлёту і ў прагназаваньні далейшых тэндэнцыяў на рынку.

## Нізкія заробкі ў Беларусі

**Беларусь займае трэцяе месца ў СНД па ўзроўні заробкаў (зьвесткі статкамітэту СНД).** У першым паўгодзьдзі 2003 г. сярэдняя зарплата «брудныміі» склала ў Беларусі 231 тыс. рублёў, ці 112 даляраў. На першым месцы Расея — 167 даляраў, на другім Казахстан — 149. За Беларусяй ідзе Ўкраіна — 80 даляраў.

## Разбудова шашэй вакол Менску

**Да 2005 г. маюць быць разбудаваныя ўсе аўтадарогі ў зоне 50 км вакол Менску.** Міністэрства транспарту плянуе пашырыць кавалак Менск—Фаніпаль з 4 да 6 палосаў. 6-палосны рух зьвязіцца і на Магілёўскай шашы. Удасканаляць дарогу Менск—Нарач. На ўсіх гасьцінцах мяркуецца ўжываць асаблівы тып асфальтабэтону. Акрамя таго, на 6-палосных кавалках зьявяцца агароджы, шумаахоўныя экраны, супрацьасьляпляльныя прыстасаваньні, інфармацыйныя таблё.

## Цяжкасьці на «Беларуськаліі»

**Сельская гаспадарка Беларусі зь вясны завінавацілася салігорскім шахцёрам 31 млрд руб., што пагражае прадпрыемству фінансавым крызысам і ростам неплацяжоў.** Кіраўніцтва галіны зьвярнулася ва ўрад з просьбай паспрыяць вырашэньню сытуацыі.

## Чаргінец будуе каналы

**Група беларускіх дэпутатаў на чале з сэнатарам Чаргінцом фармуе міжнародны камітэт, які вывучыць эканамічную мэтазгоднасьць правядзеньня двух водных калідораў, якія злучаць Чорнае і Балтыйскае моры.** Адзін можа злучыць Віслу, Буг, Прыпяць і Дняпро, а другі — Дзьвіну й Дняпро. Прыкладны кошт праектаў можа скласьці ад 5 да 10 млрд даляраў. Але пакуль няма нават 500 тыс. даляраў на вывучэньне эканамічнай мэтазгоднасьці справы.

## У Ялабузе зьбіраюць «Беларусаў»

**На Ялабускім заводзе легкавікоў пачалі зьбіраць трактары «Беларус».** Супольны беларуска-татарскі праект мае да 2005 г. давесьці зборку «Беларусаў» да 5000 у год.

## Мыты за растаможку аўтамабіляў

**З 17 жніўня павышаныя з 0,5 эўра да 0,55 эўра за 1 куб. см стаўкі «растаможкі» машынаў, якім менш за 3 гады** і аб'ём рухавіка якіх больш за 2500 кубікаў, а таксама «караў», якім больш за 10 гадоў. Для ўсіх астатніх аўтамабіляў дзейнічае ранейшая стаўка 0,35 эўра за кубік.

## Зьніжаная стаўка рэфінансаваньня

**З 18 жніўня стаўка рэфінансаваньня Нацбанку зьніжаная на 1% і складае цяпер 30% гадавых.** Інфляцыя за сем першых месяцаў году склала ў цэлым 16,2%.

**МБ**



Сябры БНФ і жодзінскія эколягі правялі на Вялейшчыне агітацыйную кампанію «РЛС — пагроза для Беларусі». Сорак маладых людзей распаўсюдзілі сярод вяскоўцаў паўтары тысячы ўлётак, тлумачылі людзям, якую шкоду іх здароўю нясе расейская радыёлякацыйная станцыя. Фронтаўцы зьбіраюцца праводзіць такія акцыі штогод, аж пакуль у Беларусі не застанецца расейскіх вайсковых аб'ектаў.

## У Слоніме даражэй, чым у Менску

**Ужо другі год праезд у выходныя дні ў слонімскім грамадзкім транспарце каштуе даражэй, чым у сталіцы.** Мясцовыя камуністы дамагаюцца скасаваньня непапулярнага ў народзе рашэньня, але ўлады адмоўчваюцца.

У выходныя праезд у слонімскім аўтобусе каштуе 400 руб. (для пэнсіянэраў — 200), у Менску ж — 220. І гэта пры тым, што прыбыткі жыхароў сталіцы і раённага цэнтру непараўнальныя. Слонімская арганізацыя ПКБ ініцыявала кампанію па зборы подпісаў за адмену падвойнай аплаты праезду. Дакумэнт з 900 подпісамі ўжо два месяцы ляжыць на стале старшыні райвыканкаму Мечыслава Касьцюка, і іх збор працягваецца. Каардынатар акцыі камуніст Віктар Герасімчык кажа, што раней мясцовыя ўлады акуратна, у тэрмін, давалі адказы на запыты і лісты, а цяпер маўчаць. Ня мела выніку і спроба Герасімчыка ўнесьці гэтае пытаньне на разгляд сэсіі райсавету. Яго падтрымалі толькі 8 з 54 народных абраньнікаў.

**АТ, Слонім**

## Дубль дажынак пройдзе ў Воршы

**Заключны этап Першага ўсебеларускага экалягічнага форуму, абвешчанага Міністэрствам прыродных рэсурсаў, пройдзе ў верасьні ў Воршы.** Каля мільярда рублёў выдаткаваных з абласнога бюджэту і экалягічнага фонду на добраўпарадкаваньне гораду. Цэнтар цяпер нагадвае суцэльную будаўнічую пляцоўку. Шпарка ідзе рэканструкцыя гарадзкога парку культуры і адпачынку, будынкаў былых кляштароў езуітаў і трынітарыяў (у іх потым уладкуюцца архіў, музэі мастацтваў і прыроды), дому культуры. Асфальтуюцца разьбітыя ўшчэнт дарогі, брукуюцца ходнікі, рамантуюцца дахі, велікоднымі яйкамі выглядаюць пафарбаваныя дамы. Гэткага размаху добраўпарадкаваньня Ворша ня ведала з дня свайго заснаваньня. Разам з тым, шмат якія вуліцы і сядзібы нават у цэнтры гораду нагадваюць скансэны, бо, здаецца, час спыніўся на іх дзесьці ў пачатку або ў сярэдзіне мінулага стагодзьдзя... Каб цалкам давесьці горад да ладу, патрэбна ладзіць тут «Дажынкі», і ня раз.

## Фатальныя «сто грам»

**16-гадовая аршанская школьніца Ірына, якая пасьпяхова вытрымала іспыт па гісторыі (10 балаў), вырашыла сваю перамогу «адзначыць».** Дома выпіла сто грамаў гарэлкі, а потым выйшла да сяброў у двор. Тут ёй стала дрэнна, і дзяўчынка з алькагольным атручэньнем трапіла ў бальніцу. Дзякуй Богу, абышлося пярэпалахам. Бывае й горш. Так, у мінулыя выхадныя па парушэньне антыалькагольнага заканадаўства да адміністрацыйнай адказнасьці прыцягнутыя 116 падлеткаў. Асноўны «ўраджай» нецьвярозых дзетак даюць гуляньні кшталту Дня гораду, Сьвята моладзі і г.д.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Дрэва на чужыне доўга не жыве

**У Берасьці засох пірамідальны дуб, адна з славутасьцяў гораду.** Пасаджаны ён быў графам Патоцкім за польскіх часоў, лічыўся помнікам прыроды рэспубліканскага значэньня. Унікальнае дрэва было прывезена з Паўднёвае Амэрыкі. У Беларусі ў прыродзе не расьце. Пару гадоў яно прысыхала, ажно ў сёлетнюю сушу зусім «дало дуба». Эколягі зь Берасьцейскага ўнівэрсытэту тлумачаць гэта пацяпленьнем клімату, пагаршэньнем экалягічнае абстаноўкі (у Берасьці за 10 апошніх гадоў колькасьць аўтамабіляў вырасла ў тры разы). Але дрэва на чужыне й само сабой доўга не жыве, адзначаюць яны.

## Моладзь за беларусізацыю піва

**Навучэнцы Політэхнічнага тэхнікуму ды ўнівэрсытэтаў гораду сабралі 275 подпісаў за беларусізацыю этыкетак на піве берасьцейскага бровару і прапанавалі сваё паслугі па перакладзе.** Пачалі справу Віктар («Ёрык») Клімус зь сябрамі. Адказу з заводу пакуль няма.

**Мікола Бугай, Берасьце**

## Што за бар бяз музыкі

**Больш за 200 гарадзенцаў падпісаліся пад зваротам да гарвыканкаму. У ім — просьба адмяніць рашэньне аб забароне праводзіць канцэрты на адкрытай пляцоўцы каля бару «Віленскі».** Тыя канцэрты сталіся прыемнай традыцыяй летняга сэзону і наблізілі наш горад да цэнтральнаэўрапейскіх стандартаў. Пляцоўка каля «Віленскага» пасьпела стацца ўлюбёным месцам адпачынку. Цягам пятнаццаці дзён падпісанты чакаюць адказу з гарвыканкаму.

**Андрэй Мялешка, Гародня**

## БНФ абсталяваў пляж

**Івянецкая суполка БНФ пад кіраўніцтвам Вінцэнта Солтана абсталявала пляж.** Былі зроблены лаўкі, «грыбкі», шатні для пераапрананьня ды іншае. А 2 жніўня суполка наладзіла талаку, у часе якой усё гэта было ўстаноўлена. У рамках акцыі адбыўся конкурс дзіцячага малюнку на сьценах пераапранальных кабінак, удзельнікі якога атрымалі ад Партыі БНФ у падарунак кнігі. А першы дарослы наведнік шатні ўзнагароджаны бутэлькай піва.

Моладзь купаецца, загарае, гуляе ў пляжны валейбол. Добрыя справы, карысны падарунак івянчанам.

**Мікалай Куксо, Івянец**

## «Нашчадкам» — 20 гадоў

**Каля вёскі Строчыцы адбылася сустрэча сяброў патрыятычнай беларускай суполкі «Нашчадкі», заснаванай у 1983 г.** Студэнцкі будатрад «Нашчадкі» быў створаны на гістарычным факультэце пэдінстытуту (цяперашні ўнівэрсытэт імя М.Танка) з мэтай адраджэньня народных традыцыяў, нацыянальнай культуры, гуртаваньня моладзі. Ягоным першым камандзірам быў Генадзь Сагановіч, тады яшчэ студэнт. «Нашчадкі» будавалі Музэй народнай архітэктуры і быту ў Строчыцах, працавалі на археалягічных раскопках. Характэрна, што шчыравалі студэнты бясплатна, пералічваючы сродкі на рахунак музэю, у Ждановіцкі дзіцячы дом, сям'і сябра, які загінуў. Бяскрыўдная дзейнасьць «Нашчадкаў» у 80-я выклікала моцны ціск з боку КДБ ды інстытуцкага начальства, але патрыятычная суполка выстаяла. Дзейнасьць яе спынілася ў пачатку 90-х.

**СЁ**

ПОШТА

# Брудныя правакацыі з выкарыстаньнем Левіна

**У адной менскай газэце былы прэзыдэнт Зьвязу беларускіх габрэйскіх арганізацыяў Леанід Левін зрабіў «адкрыцьцё»: дзяржаўнага антысэмітызму ў Беларусі няма, але «асабіста яшчэ застаўся».** І вызначаюць яго «дэпутаты Касьцян, Навасяд, Фралоў», прычым «спавядаюць яны нелюбоў да габрэяў усюды, дзе б ні знаходзіліся». Пра Касьцяна — размова асобная, але які «антысэмітызм» можна закінуць Навасяду і Фралову, мне незразумела.

Вось вядомыя факты, што тычаць Навасяда: накіраваў запыт у Мінкульт адносна незаконнага разбурэньня сынагогі на Дзімітрава, 3; падпісаў калектыўны ліст у пракуратуру з тае ж нагоды; падпісаў ліст 75 дэпутатаў «палаткі» супраць разбурэньня аб'ектаў беларускай і габрэйскай гісторыка-культурнай спадчыны ў Менску.

Генэрал Фралоў ня толькі падпісаў два згаданыя лісты, але й прыйшоў у суд, каб падтрымаць абаронцаў сынагогі. А ў кастрычніку 2002 г. сп.Фралоў наведаў жалобны мітынг на «Яме», ушанаваўшы памяць габрэяў, якія загінулі ў менскім гета. Ён жа накіраваў, разам зь іншымі дэпутатамі, пратэст супраць юдафобскіх і антымусульманскіх выказваньняў Касьцяна ў сьнежні 2002 г.

Я ня стаў бы марнаваць час на абвяржэньне гэтых трызьненьняў, аднак для многіх беларусаў Леанід Левін застаецца сымбалем «габрэйскай грамады». Таму — выказваю нязгоду з галасльнымі абвінавачаньнямі свайго супляменьніка і пратэст.

**Вольф Рубінчык, Менск**

# Вайна ў касьцёле ў Зембіне

**Мястэчку Зебін (афіцыйна пішуць «Зембін»), што на скрыжаваньні шляхоў з Барысава на Плешчаніцы і з Лагойску на Бегам'е, больш за 400 гадоў.** У Зебіне ёсьць царква і касьцёл. Абодва храмы як яшчэ ў вайну былі спаленыя, так і стаялі амаль паўвеку. Абшарпаныя, але велічныя муры нагадваюць паранернага і зьбітага, але нязломнага духам і моцнай веры хрысьціяніна апостальскіх часоў. На франтоне касьцёлу захавалася постаць Маці Божай. З сумам Яна пазірае ўніз, на мястэчкоўцаў, якія за 12 гадоў так і не аднавілі ані царквы, ані касьцёлу (хоць спробы і былі).

Сёньня ў касьцёле гараць дымавыя шашкі, чуваць страляніна: рэжысэр Вячаслаў Нікіфараў здымае стужку «На безыменнай вышыні». На маю думку,ператварыць храм у такую здымачную пляцоўку — абраза Бога. Гэты выпадак — ня першы. У 1960-я ў Зебіне ўжо здымалі фільм пра вайну — тады танкам пабурылі цэлую сьцяну ў царкве. Ня думаю, што рэжысэр меў рацыю, як і барысаўскія ўлады, якія выдавалі дазвол на здымкі.

**Арцём Шчэцька, Менск**

# Ксёндз дзейнічае некарэктна

**Перадканфліктная сытуацыя склалася між ксяндзом магілёўскага касьцёлу Сьв. Станіслава Раманам Факсінькім і абласной арганізацыяй БНФ.** Фронт займае памяшканьне на вул.Ленінскай, якое месяц таму выкупіў ксёндз для патрэбаў парафіі.

Дамова на арэнду офісу паміж БНФ і гарвыканкамам дзейнічае да 1 студзеня, а гэта азначае, што ўлады мусілі выдзеліць фронтаўцам новае памяшканьне да прыняцьця рашэньня аб продажы. Але гэтага зроблена не было, а арганізацыі прапанаваныя памяшканьні, што знаходзяцца па-за цэнтрам места альбо ў месцах, куды цяжка трапіць.

Ксёндз настойвае, каб БНФ хутчэй шукаў сабе іншае памяшканьне. Нават абяцаў павесіць на дзьверы офісу свой замок, матывуючы гэта тым, што будынак зьяўляецца «прыватнай уласнасьцю» (так і напісаў на дзьверах), а БНФ ня мае сродкаў, каб своечасова плаціць арэнду. Старшыня магілёўскай арганізацыі БНФ Рыгор Кастусёў дамовіўся з ксяндзом: пакуль праблемы з памяшканьнем ня будуць вырашаныя, арганізацыя можа месьціцца ў старым офісе. Аднак уваход туды абмежаваны. Між тым, калі ўлады даведаюцца, што арганізацыя не знаходзіцца на месцы сваёй «прапіскі», яны могуць за адно гэта скасаваць рэгістрацыю.

Такія паводзіны ксяндза, на нашу думку, некарэктныя, улічваючы, колькі БНФ зрабіў для адраджэньня парафіі: і збор подпісаў за вяртаньне касьцёлу сьв.Станіслава вернікам, і дапамога ў рамонце. Гэта бадай што адзіны выпадак у Беларусі, у якім пробашч ідзе на такі канфлікт з БНФ.

**Міраслаў Сакольскі, Магілёў**

## АД ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**У арганізацыю ТБМ рэгулярна зьвяртаюцца грамадзяне, абураныя зьмяншэньнем беларускамоўнага вяшчаньня ў праграмах навінаў БТ-1.** Паведамляем, што мы ўжо зьвярнуліся да кіраўніка БТ-1, сп.Рыбакова з афіцыйным лістом, але пакуль не атрымалі адказу. Мы раім грамадзянам зьвяртацца непасрэдна ў прыёмную сп.Рыбакова Ягора праз т.: 263-43-31 альбо ў рэдакцыю праграмаў навінаў на т.: 263-82-55. Можна таксама дасылаць лісты на адрас Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусі (вул. Макаёнка, 9, 220807, Менск).

ВОДГУК

# Мова ў генах

**У «НН» №28 быў артыкул Ф.Субеля «Мозг выбірае родную мову ў дзевяць месяцаў».** Хацеў бы во што дадаць. На думкі й паводзіны чалавека ўплывае ня толькі ягоная сьвядомасьць, але й падсьвядомасьць. Адрозьніваюцца тры пласты ў структуры падсьвядомасьці. Верхні — асабістая падсьвядомасьць, у якой захоўваюцца ўспаміны дзяцінства й забытыя перажываньні. У сярэднім пласьце — запісы сямейнай, народнай, расавай гісторыі. Самы ніжні пласт падсьвядомасьці — калектыўная падсьвядомасьць, супольная для ўсіх людзей. Асаблівую ўвагу я хацеў бы засяродзіць на другім пласьце, які навукоўцы называюць «голасам крыві». Сямейныя перажываньні пераходзяць у спадчыну, ад бацькоў да дзяцей перадаецца мэнталітэт, што знаходзіць адлюстраваньне ў сэмантыцы словаў. А паколькі мова зьяўляецца адлюстраваньнем унутранага сьвету чалавека, то, на маю думку, — наша родная мова запісаная ў нашых генах.

**Сяржук Пятровіч, Барысаў**

# Рабілі хлопцы «Ніву»

## зарабілі канфлікт

**У Беластоку разгарэўся скандал вакол адзінай беларускай газэты Польшчы — «Нівы». Падчас праверкі яе фінансава-гаспадарчай дзейнасьці Найвышэйшая кантрольная палата Польшчы выявіла парушэньні, у тым ліку — нямэтавае выкарыстаньне дзясяткаў тысячаў даляраў дзяржаўнай датацыі. Выдаўцы газэты сьцьвярджаюць, што справу разьдзімаюць польскія посткамуністы.**




АЛЁНА АНДРЭЕВА

Супрацоўнік кантрольнай палаты сядзеў у рэдакцыі газэты паўтара месяца. Неўзабаве пасьля гэтага беластоцкі «Kurjer poranny» выбухнуў сэнсацыяй: «Ніваю» хутка зоймецца пракуратура. Тэму з ахвотай падхапілі польскія СМІ. Галоўны рэдактар «Нівы» Яўген Мірановіч сьведчыць: у выніковым дакумэнце праверкі агульная дзейнасьць рэдакцыі ацэньвалася станоўча, за выключэньнем вядзеньня бухгальтэрыі.

Праверка выявіла, што рэдакцыя завышала наклад тыднёвіка. У 2001 г. — на 24%, адпаведна атрымала датацыю ад Мінкульту на 42,4 тысячы злотых больш. У 2002 г. «Ніва» друкавалася сярэднім накладам 1197 асобнікаў, а афіцыйна падавала — 2200. Я.Мірановіч парыруе: наклад не завышаўся. Бралася сярэдняя гадавая лічба (калядны нумар з календаром выходзіць вялікім накладам). Кантралёр выявіў, што кошты выданьня газэты за 2001—2002 г. былі завышаныя на 102 тыс. злотых (26,1 тыс. даляраў). На набыцьцё паштовых марак было выдаткавана з датацыйных грошай 8 тыс. даляраў, і такую ж суму «Ніва» атрымала на гэтыя ж мэты ад Фонду Сьцяпана Батуры. Ніўцы ж кажуць, што Фонд Батуры прафінансаваў перасылку газэты падпісчыкам у Беларусь. Усяго кантралёр налічыў 174 тыс. датацыйных злотых (каля 44,6 тыс. даляраў), выкарыстаных не паводле прызначэньня. Памер дзярждатацыі «Ніве» ў 2001 г. складаў 382 тыс. злотых, у 2002 г. — 326 тыс., а сёлета — 310 тыс. злотых. (От каб беларускім газэтам ды гэткія датацыі ад роднага ўраду, якія мае «Ніва» ад польскага!)



МІКОЛА ВАЎРАНЮК, «НІВА»

Кіраўніцтва «Нівы» сьцьвярджае, што не парушыць таго закону вельмі цяжка. Датацыя на рэдакцыйны рахунак прыходзіць увесну, а ўжо да канца кастрычніка трэба даць справаздачу пра гэтыя грошы. Выходзіць, што 52 нумары «Нівы», заплянаваныя на год, мусяць выйсьці за шэсьць месяцаў. Каб не рабіць перапынку ў выданьні, супрацоўнікі змушаныя былі ісьці на хітрыкі. Адсюль — завышэньне коштаў і накладаў. Зэканомленыя грошы, аднак, ішлі не ў кішэні журналістаў, а на выданьне газэты ў «дадатацыйны пэрыяд» і на іншыя культурніцкія праекты. Сытуацыя добра знаёмая многім выдаўцам незалежнай рэгіянальнай прэсы ў Беларусі.

Рэдакцыйны актыў «Нівы» пэўны: скандал зь «Ніваю» штучна створаны з удзелам левых палітычных сілаў, якія цяпер пры ўладзе ў Польшчы. На апошніх выбарах беларусы склалі ім сур'ёзную канкурэнцыю на Беласточчыне і прымусілі зноў з сабой лічыцца. Адсюль і атака на «Ніву», скандал вакол якой мусіў бумэрангам ударыць і па шэрагу лідэраў беларусаў Беласточчыны. Рэч і ў тым, што «Ніву» заснавалі за ПНР і выдаўцом яе было Беларускае грамадзка-культурнае таварыства, цесна зьвязанае зь левымі і беларускім урадам (цяпер на чале яго Ян Сычэўскі). Але на пачатку 90-х выдаўцом тыднёвіка стала Праграмная рада, у склад якой увайшлі прадстаўнікі васьмі арганізацый, што прадстаўляюць беларускую меншасьць, пераважна зьвязаныя з дэмакратычнай апазыцыяй часоў ПНР.

**39,9 тыс. чалавек размаўляюць у хаце па-беларуску ў Падляскім ваяводзтве Польшчы. Гэта вынікае з апублікаваных вынікаў перапісу.**

Наколькі атака ўдалася, пакуль казаць рана. Калі Мінкульт палічыць праступак рэдакцыі вельмі сур'ёзным, можна чакаць спыненьня штогадовай датацыі на выданьне газэты. А гэта сьмяротны прысуд для «Нівы» ў тым выглядзе, у якім яна існуе ўжо амаль паўстагодзьдзя. (Газэта невялікае беларускае меншасьці акупляецца толькі на 10%.)

«Справа нават не ў датацыях, а ў стане нашага грамадзтва, — кажа гісторык Алег Латышонак. — Падае колькасьць чытачоў, якія валодаюць беларускай мовай. Але ў любым выпадку «Ніва» будзе выходзіць».

**Сяргей Ёрш**

### Яўген Мірановіч: Мы не раскідваліся, а ашчаджалі

У штаце газэты сёньня працуе восем чалавек. Мы ня маем магчымасьці ўзяць на стала бухгальтара. Жанчына, якая выконвае яго функцыі, прыходзіць у рэдакцыю два разы на месяц, пра штосьці забываецца, нешта ня так афармляе… Закіды ў нямэтавым выкарыстаньні сродкаў — гэта стварэньне чуткі, што нехта раскідаецца дзяржаўнымі грашыма. Насамрэч мы іх ашчаджалі, каб выданьне газэты не перарывалася.

### «Głos znad Niemna» за «Ніву»

**Валер Булгакаў, рэдактар «Arche»:** «Калі зачыніцца беластоцкая «Ніва», гэта можа стаць для менскіх уладаў сыгналам для закрыцьця «Głosa znad Niemna».

### Амэрыканскі дыплямат крытыкуе Польшчу, хваліць Расею, Літву

**У інтэрвію радыё «Свабода» Тэд Контэк, былы першы сакратар пасольства ЗША ў Беларусі, ухваліў зьмену падыходаў кіраўніцтва Расеі да Беларусі. «Расея ў апошнія 6—8 месяцаў фактычна далучылася да нас у падтрымцы абмежаваных дэмакратычных рэформаў, у прыватнасьці рэформы выбарчага заканадаўства».**

Яшчэ амэрыканскі дыплямат адзначыў, што беларуская палітыка Польшчы зьмянілася з прыходам да ўлады польскіх сацыял-дэмакратаў. На думку Контэка, польскі ўрад часам балянсуе на мяжы парушэньня санкцыяў Эўразьвязу, што забараняюць кантакты з вышэйшымі службовымі асобамі Беларусі.

Разам з тым Тэд Контэк высока ацаніў пазыцыю Літвы, якая «намагаецца спрыяць дэмакратызацыі Беларусі, нягледзячы на сваю залежнасьць ад гандлю зь Беларусяй». Контэк лічыць, што роля Літвы ў адносінах Захаду зь Беларусяй стане яшчэ больш значнай пасьля ўваходу Літвы ў Эўразьвяз налета.

### Не служыў — не дэпутат

Вярхоўны канстытуцыйны суд Эгіпту прызнаў несапраўдным дэпутатства 22 актывістаў кіроўнай Нацыянальнай партыі Эгіпту ў Народнай радзе. Матывацыя — гэтыя чыноўнікі не служылі ў войску. Сярод «выгнанцаў» ёсьць нават некалькі ўрадавых міністраў. У Эгіпце вайсковая служба — абавязковая ўмова для дэпутацтва ў Народнай радзе краіны, а той, хто не служыў, ня мае права прадстаўляць народ. Пастанова суду можа выклікаць роспуск дзейнае Рады.

### Ізраільскія беларусы пратэстуюць

**13 жніўня ў Ерусаліме, ля закуемненых вокнаў канцылярыі прэм'ер-міністра Ізраілю, адбылася дэманстрацыя, зладжаная аб'яднаньнем выхадцаў зь Беларусі.** 200 чалавек пратэставалі супраць закрыцьця ізраільскага пасольства ў Менску. Ніхто з афіцыйных службоўцаў да дэманстрантаў ня выйшаў, хіба «засьвяціліся» на мітынгу дэпутатка парлямэнту Марына Салодкіна і першы пасол Ізраілю ў Беларусі Эліягу Валк. Салодкіна заклікала да стварэньня камітэту ў абарону пасольства, ды толку зь яго цяпер... З 18 ліпеня пасольства Ізраілю зачынена «з эканамічных прычын».

### Калёнія на Месяцы

**Стварэньне калёніі на Месяцы «магчымае ў бліжэйшыя дваццаць гадоў», кажа Бэрнард Фоінг, навуковец з Эўрапейскай агенцыі касьмічнай прасторы.** І тэхнічныя магчымасьці тут не асноўная перашкода. Галоўнае, каб была палітычная воля да стварэньня базы для калянізацыі ці захаваньня чалавечага віду. Фоінг — распрацоўшчык невялікага робата «Smart-1», якога Эўразьвяз у верасьні выправіць на Месяц. У Канвэнце, што ствараў эўраканстытуцыю, нават гучалі ідэі запісаць у мэты Эўразьвязу «заваёву космасу». Аднак у канчатковы варыянт гэты пункт ня трапіў.

### Мутацыя вірусу СНІДу

**Амэрыканскія вучоныя выявілі новы гібрыдны вірус ВІЧ.** Гэта значна ўскладніць пошук лекаў супраць СНІДу. Першай хворай на гібрыдны вірус стала жанчына з Кеніі. У 1986 г. у яе знайшлі СНІД-ВІЧ-1 тыпу А, аднак цягам некалькіх гадоў яе стан быў здавальняльны. Толькі ў 1992 г. хвароба ўскладнілася. Аналізы паказалі, што колькасьць крывяных цельцаў скарацілася на 80%. Далейшыя дасьледаваньні выявілі ў крыві жанчыны ВІЧ-1 тыпу С. Празь некаторы час высьветлілася, што ў пацыенткі выявілі «зьмешаны» вірус з адметнасьцямі двух тыпаў. Раней гэта падавалася папросту немагчымым. Вучоныя кажуць, што паміж галоўнымі тыпамі ВІЧ адбыўся абмен генамі, і гэта выклікала зьмяненьне складу крыві і зьяўленьне гібрыду.

### Ленін «засьвяціўся»

**Помнік Леніну выпраменьвае радыяцыю, у 2—3 разы большую за норму.** Прынамсі ва ўкраінскім Запарожжы. Небясьпечная статуя стаіць на мясцовым рынку, і санстанцыя ўжо паведаміла жыхарам, што знаходзіцца побач з бальшавіцкім правадыром небясьпечна. Пакуль невядома, чаму «сьвеціцца» Ільліч.

**Падрыхтавалі Францішак Субель, Руслан Равяка, Сяргей Будкін, ВР**

# Агенты дзьвюх выведак

## Як чэкісты вэрбавалі беларускіх нацыяналістаў

**Дасьледчыкі працягваюць цікавіцца гісторыяй вэрбоўкі беларускіх нацыяналістаў у сталінскія часы. Згода на супрацоўніцтва была для многіх адзіным шляхам да вызваленьня. І многія дзякуючы ёй ураталіся. Праблема такіх дасьледаваньняў у тым, што аўтар вымушаны грунтавацца выключна на матэрыялах ГБ, прычым не зь яшчэ не даступных цалкам архіваў, а з урыўкавых публікацый, часта санкцыянаваных самой спэцслужбай. Факты ў такіх публікацыях мяшаюцца з выдумкамі, нярэдка з мэтай наўмысна здыскрэдытаваць таго ці іншага чалавека. Таму можна гаварыць пра здагадкі, не пра гістарычную праўду. Бясспрэчна адно: ніводзін сапраўдны патрыёт пішчом у «стукачы» ня лез. На жаль, расказаць пра свае драмы яны ўжо ня могуць.**



«СБ»

**Атаман Герман Шыманюк пасьпеў уцячы ў савецкую Беларусь, а ягоную жонку схапіла польская паліцыя**

**Працяг са старонкі 1.**

Як былая студэнтка Віленскага ўнівэрсытэту, дзяячка Самапомачы ў Слоніме **Ніна Якубовіч**.

Летам 1944-га яна з сынам выехала ў Нямеччыну. Але там сям'я разлучылася: Ніна змушаная была пакінуць хлопчыка ў Бэрліне, а сама апынулася ў Мюнхене. Дзесьці ў 1946 г. Якубовіч пераходзіць мяжу амэрыканскай зоны акупацыі, каб знайсьці сына на савецкай тэрыторыі. У Бэрліне яна сустракае знаёмую, былую сакратарку мясцовага беларускага прадстаўніцтва **Ніну Сім**. Разам кабеты адшукалі хлопчыка — яго прытуліла нямецкая сям'я. Ніна Якубовіч і думаць не магла, што яе цёзка працуе на савецкую выведку... Перад адыходам на Захад Сім здае сяброўку чэкістам.

### На кану — дзіця

Якубовіч было патлумачана, што сына яна забярэ, але спачатку трэба выканаць некалькі заданьняў на амэрыканскай тэрыторыі. Не пагодзішся — загрыміш у канцлягер. Ведаем пра тваю Самапомач. Ніна пагадзілася. Але перайшоўшы мяжу, усё распавяла амэрыканскім контрвыведнікам. Джэймсы Бонды распачалі гульню зь «Сьмершам». Атрыманыя ад іх зьвесткі Якубовіч перадала чэкістам у Бэрліне, але замест сына атрымала чарговае заданьне... Гэта была пастка. Даведзеная да адчаю жанчына рызыкнула: адведваючы сына, выкрала яго і ўцякла ў амэрыканскае прадстаўніцтва. Амэрыканцы, выслухаўшы яе гісторыю, сказалі, што нічым дапамагчы ня могуць: выбірайся, кабета, з Бэрліна сама. А дзяржбясьпека ўжо дыхала Ніне ў патыліцу... Два тыдні хавалася яна з сынам у жаночым кляштары, але ўрэшце высьлізнула-такі ў Заходнюю Нямеччыну. Пазьней Якубовіч атрымала вышэйшую мэдычную адукацыю і разам з сынам выехала ў Амэрыку. Гэтую гісторыю распавёў у сваіх успамінах беларускі дзяяч Лявон Галяк.

Ня толькі для Ніны Якубовіч згода на «супрацоўніцтва» была адзінай магчымасьцю захаваць жыцьцё і вырвацца на волю. Праз гэта прайшлі і два беларускія генэралы — **Мікола Дзямідаў** і муж Натальлі Арсеньневай **Францішак Кушаль**.

### Тры генэралы

Капітан Францішак Кушаль трапіў у савецкі палон у верасьні 39-га. Праз два месяцы ў Старабельскім лягеры ваеннапалонных яго завэрбавала дзяржбясьпека. Кушаля меркавалі выкарыстаць для «распрацоўкі» ваеннапалонных-антысаветчыкаў. Упершыню пра гэта напісалі ў газэце «Рэспубліка» Ўладзімер Адамушка і Аляксандар Бродскі. Яны падалі факсыміле падпіскі Кушаля аб згодзе на супрацоўніцтва ды яго характарыстыку, узятую са справы, якая захоўваецца ў архіве ФСБ: «Як асьведамляльнік зарэкамэндаваў сябе талковым, ведае нашу працу. Матэрыялы даваў інфармацыйнага характару. Падчас допытаў выказваў рашучасьць да выкананьня больш адказных нашых даручэньняў». У траўні 1940-га Кушаля пераводзяць у Маскву, на Лубянку, і кідаюць у камэру да генэрала Андэрса. Амаль год яны разам кармілі вошай. А вясной 1941-га Кушаля нечакана вызваляюць, дазволіўшы жыць у Беларусі. Вяртаюць з казахстанскай высылкі і ягоную сям'ю. У Беларусі Кушаляў і засьпела вайна. Францішак уключаецца ў вайсковы рух, камандуе Беларускай краёвай абаронай... Пасьля вайны, ужо на эміграцыі, ад прэзыдэнта Рады БНР ён атрымаў ранг генэрала. Да канца жыцьця праціўнікі папікалі Кушаля «цудоўным выратаваньнем» з кіпцюроў дзяржбясьпекі, спасылаючыся на ўспаміны Андэрса.



**Кастусь Езавітаў**

**Мікола Дзямідаў** трапіў на Лубянку ў 1940-м. Бальшавікі схапілі яго ў Латвіі, дзе ён жыў у міжваенны час, працуючы ў беларускіх арганізацыях. Неабыякая птушка трапіла ім у рукі: Дзямідаў стаў пад сьцягі БНР яшчэ ў 1918-м. Быў вайсковым камэндантам Горадні, хадзіў з Булак-Балаховічам на Мазыр у 20-м (тады і атрымаў ад «бацькі» генэральскі ранг), пасьля партызаніў з сваім батальёнам, даючы прыкурыць «чырвоным маскалям». З такой біяграфіяй чалавек меў толькі дзьве дарогі: да Абрама на піва з куляй у патыліцы ці ў бальшавіцкія сэксоты. Дзямідаў выбраў другое. Пасьля вэрбоўкі яго адпусьцілі. Ён таксама павінен быў «працаваць» сярод беларускіх дзеячоў, многія зь якіх схаваліся ад бальшавікоў за мяжой. Падчас нямецкай акупацыі Дзямідаў быў актыўны ў беларускім вайсковым руху, стварыў батальён у Лідзе, а пасьля служыў у вайсковых фармацыях у Нямеччыне. Пасьля вайны ён жыў у ЗША, узначальваў антыбальшавіцкую вэтэранскую арганізацыю. Летам 1965-га на чыкагскай вуліцы 75-гадовага Міколу зьбілі невядомыя, зламалі яму руку. Мо помста? Праз два гады пасьля гэтага здарэньня Дзямідаў памёр.



**Мікола Дзямідаў**

Трэці генэрал, **Кастусь Езавітаў**, з спэцслужбісцкае пасткі выйсьці ня здолеў. Па іроніі лёсу, у сваёй супрацы з савецкай дзяржбясьпекай Езавітаў прызнаўся, калі патрапіў пры канцы вайны ў лапы да «Сьмершу». Генэрал ратаваў жыцьцё, мяркуючы, што яго могуць паставіць да сьценкі бяз суду і сьледзтва. Вось і давялося распавесьці, што ў 1925—34 гадах, жывучы ў Латвіі, ён супрацоўнічаў з савецкімі дыплематамі-штырліцамі — Чарных і Ўльянавым. І мянушку канспіратыўную меў — Озал... У 1940 г. Езавітаў працаваў на НКВД ва ўжо савецкай Латвіі. У 1941-м яго выклікалі ў Маскву ды паставілі задачу: «Зьвязацца зь беларускай эміграцыяй і працаваць сярод яе так, каб пастарацца заняць больш высокае становішча».

Тут, відаць, і зазьзяла перад генэралам надзея калі ня выратавацца, дык хоць папрацаваць на карысьць Беларусі. У 1944 г. Езавітаў узначаліў Галоўнае кіраўніцтва вайсковых справаў БЦР. Але рабіў гэта яўна не па заданьні. Нядзіва, што на яго палявалі савецкія агенты. Адзін зь іх, латвійскі беларус **Браніслаў Юрэвіч,** быў пасланы ў 1944-м з Масквы, празь лінію фронту, у Рыгу — па Езавітава, пажадана жывога. У Рызе ён яго не засьпеў — генэрал пасьпеў выехаць у Бэрлін. Юрэвіч пайшоў па сьледу — перабраўся ў Нямеччыну, знайшоў Езавітава, здабыў ягоны давер. Нават зрабіўся ягоным ад'ютантам. І калі ў красавіку 1945-га генэрал ляжаў у шпіталі пасьля апэрацыі, агент-ад'ютант перадаў яго «Сьмершу» ды перашкодзіў скончыць жыцьцё самагубствам. Падрабязную справаздачу савецкага агента ў гэтай справе надрукаваў у 1995 г. у сваёй кнізе пра Беларускую цэнтральную раду Аляксей Салаўёў. Жывучы пасьля вайны ў Заходняй Нямеччыне, Юрэвіч распускаў чуткі, што Езавітаў жывы, здаровы і хутка вернецца. Але, урэшце выкрыты, мусіў уцякаць да сваіх гаспадароў у савецкую зону акупацыі.

### Тэрарызм пад прымусам

У пачатку 1943 г. генэрал Андрэй Уласаў, ствараючы пранямецкае «Расейскае вызвольнае войска», курсаваў між Бэрлінам, Смаленскам, Псковам, Віцебскам і Менскам. Вось у Менску яго і зьбіралася «накрыць» НКГБ. Дзеля паляваньня на «Крумкача» (пад такой мянушкай Уласаў праходзіў у гэбісцкіх шыфроўках) у горад закінулі апэргрупу на чале з падпалкоўнікам Юрыным. У Менску Юрын павінен быў праверыць і выкарыстаць двух савецкіх агентаў: «Іванова» і «Пэгаса». У сакрэтным дакумэнце паведамлялася, што «агент НКГБ БССР «Іваноў»... 1909 г.н., беларус, з вышэйшай адукацыяй, літаратар, прафэсар, у мінулым удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз вызваленьня Беларусі». Гэта ня хто іншы, як **Антон Адамовіч**, бліскучы літаратурны крытык, якому ўдалося, аднаму з адзінак, вырвацца з кіпцюроў НКВД перад вайной. Агент «Пэгас», 1896 г.н., быў кампазытарам (верагодна, **Мікола Шчаглоў**). Акрамя таго, да апэрацыі падключаўся рэзыдэнт «Саша», які працаваў загадчыкам гаража ў «Беларускай газэце», агент «Золак» — работнік аддзелу пропускаў генкамісарыяту, агент «Настаўнік», які вызначыўся тым, што «па заданьні НКДБ БССР... праз завэрбаванага агента зьдзейсьніў ліквідацыю аднаго з выбітных дзеячоў «Беларускай Народнай Самапомачы» (магчыма, ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага — нямецкімі рукамі) ды інш.

Падрабязнасьцяў пра кантакты А.Адамовіча з чэкістамі Юрына невядомыя, але генэрал Уласаў забіты ня быў. Аднак Адамовіча не пакідалі ў спакоі аж да кастрычніка 1943-га. Маёр дзяржбясьпекі Казанцаў, арганізатар забойства гаўляйтара Кубэ, вырашыў забіць і яго пераемніка — групэнфюрэра СС Карла Готбэрга. Акцыя была прызначаная на 15 кастрычніка. Снайпэр Макарэвіч, які мусіў застрэліць Готбэрга атручанымі кулямі каля будынку генкамісарыяту, чакаў у засадзе сыгналу ад «агента Іванова». Але ў гэты дзень Готбэрга ня было ў Менску. Людзі маёра Казанцава спрабавалі завэрбаваць для сваёй апэрацыі й **Сымона Кандыбовіча**, але няўдала. У справаздачы для Масквы чэкіст напіша: «Апрацоўваўся Кандыбовіч, былы кіраўнік справамі Саўнаркаму БССР. Апрацоўка яго ня мела посьпеху. Вельмі ён быў адданы немцам». Гэтыя дакумэнты адшукаў у маскоўскіх архівах расейскі гісторык Барыс Сакалоў.

А Антон Адамовіч, знэрваваны чэкісцкім шантажом, баючыся за сваё жыцьцё, выехаў у Бэрлін. Распавядаў, што ў сакавіку 1943-га ён браў удзел у падрыхтоўцы яшчэ аднаго тэракту — ліквідацыі кіраўніка беларускіх нацыянал-сацыялістаў Фабіяна Акінчыца... Той тэракт аказаўся ўдалым. Савецкія спэцслужбы не давалі Антону Адамовічу жыцьця і на эміграцыі. Мо хацелі аднавіць супрацу? Вядомы факт — там бясьсьледна зьнік яго бацька: аднойчы выйшаў з хаты і не вярнуўся. А на самога Адамовіча падкідалі абвінавачваньні ў ваенных злачынствах, якія не пацьвердзіліся.

**Сяргей Ёрш**



«БЕЛАРУС»

**У ЗША Антон Адамовіч выкладаў ва ўнівэрсітэтах**

# Good luck, mister Arlou!

**Адкрыўшы энцыкляпэдычны даведнік «Беларускія пісьменьнікі» на артыкуле «Арлоў Уладзімер Аляксеевіч», я зьдзіўлена ўбачыў, што крытычная бібліяграфія пад артыкулам абмяжоўваецца адной спасылкай — маёй рэцэнзіяй на першы зборнік наваполацкага празаіка-пачаткоўца, зьмешчанай у віцебскай газэце аж у 1985 г.**

**Што сёньня можна было б дадаць да той публікацыі? Арлова слушна называюць пераемнікам Караткевіча. Арлоў адрадзіў жанр падарожнага эсэ. Паводле ўзьдзеяньня на нацыянальную самасьвядомасьць ягоны тэкст «Незалежнасьць — гэта...» можа параўнацца толькі з курапацкімі артыкуламі Пазьняка. На праскім стале Быкава ляжала Ўладзева кніжка «Ордэн Белай мышы» — і гэта быў апошні мастацкі твор, які Быкаў прачытаў.**

**Але пакінем сур’ёзныя ацэнкі сур’ёзным крытыкам. Сёньня — пра іншага Арлова.**

Сяргей Навумчык

## Арлоў і дзеці

У 1995 г. тэмы для дыктантаў па літаратуры падчас іспытаў зачытваў з тэлеэкрану сам Лукашэнка. «Скарына ў Падуі» паводле Ўладзімера Арлова», — вымавіў з ухмылкай Лукашэнка, і ў тысячах аўдыторыяў разарвалі патрэбны канвэрт.

Ухмылка прэзыдэнта зрабілася зразумелая раніцай наступнага дня, калі тысячы абітурыентаў плакалі ля шыльдаў з адзнакамі. Я і цяпер перакананы, што ў Адміністрацыі нездарма выбралі тэкст сябра Сойму БНФ, а не былога чальца ЦК КПБ Шамякіна. Экспэрымэнты Арлова ў лексычным ды стылёвым узбагачэньні роднай мовы выйшлі абітурыентам бокам. Налета ахвотных пісаць дыктоўку па-беларуску было значна меней.

Уладзя ня з тых, хто скардзіцца на лёс, і застаецца толькі здагадвацца, як ён пакутаваў. Але з таго часу ніводзін ягоны тэкст немагчыма ўціснуць у школьны дыктант, не рызыкуючы наклікаць папрок у разбэшчваньні непаўнагетніх. Акрамя любові да Радзімы, ягоная проза прасякнутая эратызмам і напоўненая адпаведнымі тэрмінамі, а апошнія кніжкі займаюць тыя ганаровыя патаемныя месцы ў шафах, куды ў часы нашага дзяцінства бацькі хавалі Мапасана ды Заля.

Зрэшты, сучасныя дзеткі ведаюць болей за бацькоў і самі могуць сяму-таму павучыць слыннага празаіка — у такім разе, спадзяюся, публічнае чытаньне Арловым сваіх твораў перад ліцэістамі-пікетоўшчыкамі мела ўзаемны плён.

## Арлоў і Пазьняк

Цяпер, калі спрабую прыгадаць, калі і пры якіх абставінах упершыню пабачыў Пазьняка, памяць вяртае да ўстаноўчага сходу БНФ у кастрычніку 1988-га. У залі Чырвонага касьцёлу мы сядзелі побач з Арловым. Я тады прыехаў зь Віцебску, а Валодзя туляўся без кватэры ў Менску. «Кінуць косьці» вырашылі ў Алега Бембеля (тады ўжо — Зьніча, але яшчэ не праваслаўнага манаха).

«Калі-небудзь, Сяргей, мы будзем распавядаць пра гэты дзень унукам», — сказаў Валодзя падчас шпацыру па начным Менску да катэджу на Якуба Коласа, дзе мы знайшлі Бембеля, ягоную сяброўку карэянку Кёні ды трохлітровы слоік марынаваных агуркоў. А пляшку мелі сваю.

Пазьней Уладзя, як і шмат хто з інтэлектуалаў, не адмовіў сабе ў задавальненьні працытаваць словы Пазьняка пра тое, што «ў Беларусі сэксу не было». Пазьняк пасьля тлумачыў, што меў на ўвазе зусім ня сэкс, а эратызм, пра які вясковы, прыціснуты гаспадаркай беларус і сапраўды, напэўна, не здагадваўся: прыйшоў, зрабіў сваю справу — і ў сон.

Актуальнасьць такога меркаваньня нечакана адкрылася на радзіме Зянона Станіслававіча ў Іўі, куды група апазыцыйных дэпутатаў прыехала сустракацца з выбаршчыкамі. Быў вечар, да выступу заставалася некалькі хвілінаў, мы выйшлі на ганак Палацу культуры. Зь цемры пачуўся дзявочы галасок. Школьніца гадоў шаснаццаці, бычкуючы цыгарэтку, прапанавала хлопцу, паказваючы некуды ў цемру: «Пайшлі вунь у тую будыніну, перапіхнемся». Суцяшала тое, што пазбаўленая ўсялякіх прыкметаў куртуазнасьці ды эратызму прапанова была вымаўленая па-беларуску. Зрэшты, іншага і не выпадала чакаць на радзіме Пазьняка, якую нашыя нашчадкі будуць лічыць Мэккай беларускага нацыяналізму.

Сам Пазьняк заўсёды высока ставіць Арлова, што аднойчы і было прычынай нашага зь Зянонам невялікага канфлікту.

Першыя некалькі месяцаў амэрыканскай эміграцыі ў 96-м мы з Пазьняком жылі ў кватэры бацькоў Данчыка на Мангэтане; туды ж запрасілі і Ўладзю, які прыехаў на кангрэс амэрыканскіх беларусаў.

У адзін зь вечароў, набраўшы піва, віна ды адварыўшы двух вялізных лобстэраў (потым яны трапяць у кнігу «Божая кароўка на Пятай авэню») ды яшчэ пару кіляграмаў крэвэтак — мы з Уладзем адкаркавалі першую пляшку. Гадзіне а другой ночы палітычныя тэмы саступілі прыемным. Я распавёў, што ў пакоі, дзе сплю (ён належыць Данчыку), уся шафа забітая перавязанымі стосамі лістоў, якія слалі «беларускаму салаўю» ў далёкі Нью-Ёрк фанаткі з гістарычнай радзімы. Ні да гэтага, ні пасьля я ня бачыў такой колькасьці дзявочых лістоў, якую можна было вымяраць на кіляграмы. Я сказаў Уладзю, што мне ў парлямэнт дасылалі толькі просьбы заасфальтаваць вуліцу альбо «зьняць Кебіча», што для дэпутата ад БНФ было ў роўнай ступені немагчыма. Валодзя паскардзіўся, што ягоныя адрасаты — пераважна адстаўныя прафэсары гісторыі КПСС, ад якіх не дачакаешся ласкавых словаў. Абодва мы пашкадавалі, што выхаваньне (нельга чытаць чужыя лісты), а таксама высокія маральныя якасьці (у абодвух — жонкі) не дазваляюць перапісаць тузін адрасоў з надзеяй на «ўсё можа быць».

Здаецца, менавіта ў той момант у сталовую зайшоў Зянон Станіслававіч. За пітвом ды лобстэрамі я забыўся на час — а між тым у Менску ўжо было дзевяць раніцы, людзі прачнуліся і былі патэнцыйна гатовыя да палітычнай дзейнасьці. Здаецца, З.С. трымаў у руках нейкі тэкст, які трэба было адаслаць, але ўбачыў, што змагарнай працы на карысьць Бацькаўшчыны сёньня ад мяне не дачакаецца. Палова стала, дзе звычайна рабілася таемства стварэньня палітычных тэкстаў, была заваленая крэвэтачнымі панцырамі, другая — застаўленая пляшкамі з-пад піва ды віна.

Пазьняк ацаніў сытуацыю імгненна і адклікаў мяне ў калідор, «на пару хвілін для сур’ёзнай размовы».

— Я не хачу сказаць, што ты ўцягваешся ў п’янства, і не зьбіраюся цябе вучыць ці выхоўваць, бо ты сам сабе гаспадар. Палітыка вымагае цьвярозага розуму, але ты сам маеш права выбіраць, ці займацца табе палітыкай. Але ты ня маеш права на адно: спойваць Арлова. Палітыкаў шмат, а Арлоў у нас адзін.

Супраць апошняга ў мяне не было аргумэнтаў.

Арлоў, адзін зь нешматлікіх, падтрымаў нас з Пазьняком у рашэньні прасіць палітычнага прытулку — мо таму, што ведаў ня толькі пра апублікаваны «Свабодай» загад аб затрыманьні на мяжы. Мы распавялі яму пра сустрэчу ў Сэнаце, дзе нам наўпрост заявілі, што Вашынгтон можа аддаць Беларусь Маскве ў абмен на згоду Крамля прыняць у NATO краіны былога сацлягеру. Патрэбны быў нейкі крок, які б прымусіў амэрыканскае грамадзтва гаварыць пра Беларусь і паставіў Белы Дом у сытуацыю выбару. Той наш учынак даволі слушна быў названы ў прэсе «палітычным самаспаленьнем», але ў выніку рэфэрэндум 1996 г. (у адрозьненьне ад ранейшага, пра герб ды сьцяг) адбываўся ўжо пад пільнай увагай сусьветнай супольнасьці.

Мы разьвіталіся з Арловым у спадзяваньні пабачыцца ў Менску — «яшчэ да Калядаў!», як удакладніў Пазьняк.

Паводзіны героя наступнага сюжэту не дазволілі таму зьдзейсьніцца.

## Арлоў і яйцы

Да Ўладзімера Арлова беларуская проза мела толькі адзін смачна выпісаны гастранамічны тэкст — вячэра ў Дубатоўка з Караткевічаўскага «Дзікага паляваньня». Арлоў ператварыў запачаткаванае ў традыцыю і замацаваў яе на сучасным матэрыяле. Пераважна замежным — ягоныя эсэ зь іншаземных вандровак не абыходзяцца без маляўнічых апісаньняў тамтэйшай кухні.

Таму калі ў сьвяточныя сакавіцкія дні ў кітайскай рэстарацыі ў Празе мы частавалі беларускіх гасьцей (Уладзю з Валянцінай, Віктара Шалкевіча і экс-сьпікера парлямэнту Сямёна Ш.) — выбар мэню быў за Арловым.

Сярод іншага экзатычнага смакоцьця ён замовіў і чорныя яйкі ў соевым соўсе. Страва на аматара: калі хтосьці зь дзяцінства памятае пах карбіду (кідалі ў ваду, і ён пускаў бурбалкі) — дык якраз самае тое. Я неасьцярожна прывёў гэтае параўнаньне, што падштурхнула на ўспаміны і экс-сьпікера.

— А вось я вам загадаю вершаваную загадку з майго юнацтва. «У какой певчей птички чёрные яички?» Ну?

Арлоў прыгадаў, што за часамі Радзівілаў некаторыя шляхцічы трымалі ў палацах экзатычных птушак, але якая зь іх мела чорныя яйкі — вось так, без арніталягічнага даведніка, сьцьвярджаць не бярэцца. Аляксандар Лукашук няўпэўнена вымавіў пра салаўёў, якія муціравалі пасьля мэліярацыі Палесься. Іншых варыянтаў не было.

— У Пола Робсана, — даў правільны адказ экс-сьпікер.

У паліткарэктнай цішыні пачуліся струмяні фантану на іншым паверсе.

— Гэта недзе ў Новай Зэляндыі? — шэптам запыталася ў мяне аматарка падарожжаў Вольга Караткевіч.

— Гэта ў Амэрыцы. Сьпявак палітычных песьняў, прыблізна вось як Шалкевіч, толькі нэгрыцянскага паходжаньня, ён памёр гадоў трыццаць таму, — прасьвяціў я прадстаўніцу новага пакаленьня.

Праз пару гадзінаў, калі вячэра перайшла ў гатэльны нумар і стала непараўнальна больш сьціплай у стравах, затое нашмат шыкоўнейшай у асартымэнце напояў, экс-сьпікер распавёў гісторыю, якая канчаткова патлумачыла нам з Арловым прычыны таго, чаму не ўдалося разам сустрэць Каляды ў Менску.

— Калі было ўжо сабрана досыць подпісаў на імпічмэнт, мне патэлефанаваў Ельцын і сказаў: «Лукашэнкі не чапаць». Гэта быў, паўтараю, Ельцын! І што я мог адказаць Ельцыну?

— Пазьняк бы ягонага Ельцына паслаў у адказ на ..., — сказаў Арлоў ужо ў калідоры, і гэта, здаецца, была адзіная нецэнзуршчына, пачутая ад яго за ўсе гады нашага знаёмства.

## Арлоў і космас

Дзясяткі асобаў, якія дасягнулі выбітных посьпехаў у мастацтве, навуцы, палітыцы на розных кантынэнтах і былі вядомыя як беларусы паўсюль, акрамя гістарычнай радзімы, — вернутыя нам Арловым. У здольнасьці адшукаць беларускі сюжэт там, дзе, здавалася, яго быць ніяк ня можа, Уладзю няма роўных.

Вось і падчас лекцыі ў Ратгерскім унівэрсытэце Арлоў узгадаў, што якраз тут пачынаў навуковую кар’еру беларус Аўген Вярбіцкі, распрацоўшчык мэню для пакарыцеляў Месяцу — экіпажу «Апалёну-11». Вядома, што ў дзяцінстве маленькі Валодзя Арлоў марыў стаць патолягаанатамам, потым разьведчыкам, але спачатку ён хацеў быць касманаўтам, і першы ягоны вершык — пра касьмічны карабель. Што нядзіўна для пакаленьня, чыё дзяцінства прыпала на 60-я. Але пасьля таго як беларус Уладзімер Кавалёнак выракся бел-чырвона-белага сьцяга, Уладзя, як выглядае, у савецкіх касманаўтах расчараваўся канчаткова. Хоць тэма космасу, так ці інакш, прысутнічае амаль ва ўсіх ягоных творах. Неяк ён напісаў, што адчувае духоўную повязь з Армстрангам — чалавекам, які першы ступіў на Месяц і ўбачыў там нешта такое, што прымусіла яго зачыніцца ў вузкім коле сям’і. Абсалютна недаступны для журналістаў, Армстранг бадай што адзіны з нашых сучасьнікаў, якога не забудуцца, пакуль будзе існаваць чалавецтва.

Ніякіх сувязяў зь Беларусяй у Армстранга Ўладзя, на жаль, не знайшоў, і я сьпяшаюся падказаць яму канструктыўны шлях, каб ён вярнуў зь нябыту чалавека, якога мы не павінны аддаваць іншым нацыям, як аддалі Дастаеўскага, Міцкевіча альбо Глінку.

За тэлетрансьляцыяй высадкі з «Апалёну-11» на Месяц назіралі мільярды — акрамя жыхароў слабаразьвітых краінаў, дзе тэлевізараў не было, і грамадзянаў СССР, дзе было Палітбюро. Першыя словы, якія сказаў Армстранг, калі ступіў на Месяц, у беларускім перакладзе гучаць так: «Гэты маленькі крок аднаго чалавека — вялізны крок для ўсяго чалавецтва». Пазьней ён прызнаўся, што гэтая хрэстаматыйная фраза была хатняй нарыхтоўкай. А вось наступная ішла ад сэрца — «Good luck, mister Gorsky», што азначае «Посьпехаў, спадар Горскі!». Пасьля вяртаньня Армстранг зрабіў сусьветны круіз, раздаў тысячы інтэрвію, і толькі пытаньне пра загадкавага спадара Горскага пакідаў без адказу. Што тлумачыў астранаўт начальству ў НАСА — было сакрэтам. Лічылі, што гэта прозьвішча савецкага касманаўта, які мусіў быць першым на Месяцы. Але саветы, як вядома, увогуле ня высадзіліся на Месяц, і сэнс фразы заставаўся таямніцай.

Некалькі гадоў таму ў Армстранга ізноў запыталіся пра другую фразу. І — неспадзявана атрымалі адказ: «Калі я быў падлеткам, мы гулялі ў гольф. Аднойчы мяч трапіў у адчыненае акно сямейства Горскіх. Я ўзьлез на ганак, і раптам пачуў голас суседавай жонкі: «Аральны сэкс? Ты прагнеш аральнага сэксу? Мы зоймемся ім не раней, чым суседзкі хлапчук ступіць на Месяц!»

Армстранг нарадзіўся ў штаце Агаё, дзе ўжо на пачатку XX стагодзьдзя жылі дзясяткі тысячаў беларусаў. «Знаходзячыся на старце ў касьмічную прастору, я думаў пра нашу ленінскую партыю», — казаў кумір Уладзевага дзяцінства Юры Гагарын. Ступіўшы на Месяц, амэрыканскі астранаўт думаў пра канкрэтнага беларуса, пра ягоную запаветную і, у прынцыпе, дасягальную мару. Вось толькі невядома — ці дасягнутую?

Перакананы, што дасьледніцкі і літаратурны талент Уладзімера Арлова раскрые нам гэтую ды сотні іншых таямніцаў жыцьця беларусаў ва ўсе часы і на ўсіх кантынэнтах.

*Прага*

*Рэдакцыя «Нашай Нівы»*
*далучаецца*
*да віншаваньняў з Вашым*
*50-гадовым юбілеем, спадару*
*Арлоў!*

дзьве легенды ў рэдакцыі «НН»

# Слава Корань: Рок ня зьнікне!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**1999 год. Малады рок-гурт прыходзіць даваць інтэрвію на дзяржаўнае радыё. Перад запісам вядучы напрамілы бог просіць: «Толькі ня згадвайце пра Камоцкую, пра «Ўліс», а то праграму зачыняць!» А як гаварыць пра наш рок, абмінаючы «Новае неба», Кораня? Іх песьні ведаюць на памяць, сьпяваюць пад гітару. Гутарка выходзіць пустая.**

**«Новае неба» не зьбіраецца ўжо тры гады. «Уліс» трымаецца: выдае новы альбом «Люстэрка». Кася і Слава — рок-героі 90-х, і цяпер жывейшыя за многіх сёньняшніх «зямфірыстых», — гутараць з карэспандэнтам «НН».**

# Кася Камоцкая: Мы павінны абараняцца ад усіх



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Адам Глёбус пісаў на пачатку 90-х, што ўзровень беларускай музыкі вызначае менавіта «Ўліс». Чаму цяпер той узровень вызначаюць зусім іншыя?**

**Слава:** «Уліс» застаўся на сваіх пазыцыях. Папросту сёньня ў нашай музыцы зьявілася шмат гуртоў, якія капіююць расейскія. Яны знаходзяцца на паверхні, прасоўваюцца на музычны рынак і засьмечваюць яго, бо попыту на другасную музыку няма. На пачатку 90-х такога не было. Навідавоку былі толькі найлепшыя. Мы былі ўключаныя ў агульны музычны працэс, разьвіваліся паралельна з заходнеэўрапейскай музыкай, значна апярэджвалі расейцаў і ўкраінцаў. Расейскія гурты зусім нядаўна пачалі граць тое, што 10—15 гадоў таму гралі «Ўліс», «Новае неба», «Мясцовы час».

**Кася:** Крыўдна, што шмат якія песьні, створаныя ў той час, засталіся недачутыя, не дайшлі да слухача.

**«НН»: А чым адрозьніваецца «Ўліс» пачатку 90-х ад сёньняшняга?**

**Слава:** Сёньняшні «Ўліс» болей прафэсійны. А вось запалу ранейшага не стае. Дзесяць—пятнаццаць гадоў таму жаданьня было болей, чым магчымасьцяў для яго рэалізацыі. Тэхнічны ўзровень зь цягам часу падвысіўся, а вось жаданьне... Не існуе ў нас шоў-бізнэсу, які б здолеў неяк заахвоціць музыкаў — ладзіць канцэрты, аплату за іх. Каб музыкай можна было жыць.

**«НН»: Цяпер на FM-станцыях павінна гучаць не меней за 50% беларускае музыкі. Зьменіць гэтая пастанова сытуацыю ў лепшы бок?**

**Кася:** Нядаўна якраз глядзела ток-шоў «Выбар», прысьвечанае гэтай тэме. На агульным фоне Ціхановіч там выглядаў заўзятым нацыяналістам. Менавіта ён сказаў добрую фразу: «Калі ня ўводзіць у этэр беларускую музыку ў адміністрацыйным парадку, яна папросту загіне». Я думаю, што плён будзе ад гэтай пастановы. Кожная дзяржава мусіць рабіць такія нацыянал-абарончыя захады. Мы павінны абараняцца ад усіх, каб застацца сабой.

**Слава:** Усё павінна трымацца на законах іншага кшталту, якія б дазвалялі браць беларускім выканаўцам у арэнду канцэртную залю за льготную цану. Папросту падаткі для расейскіх групаў мусяць быць у некалькі разоў большыя, чым для беларускіх.

**«НН»: Слава, Вы неаднойчы казалі, што новы альбом «Улісу» — «Люстэрка» — найлепшы. Паўстае пытаньне: найлепшы — чым?**

**Слава:** Амаль усе запісы беларускіх музыкаў не найлепшай якасьці. Іначай пакуль і быць ня можа, бо трэба шмат грошай, каб пасядзець у студыі столькі, колькі трэба. Грошай не стае, таму ўсё робіцца на скорую руку. Запісваючы «Люстэрка», я пайшоў іншым шляхам. Матэрыял быў запісаны ў студыі, а зводзіўся ён у мяне дома. На зьвядзеньне якраз і пайшла большасьць часу. Выйшла няблага.

**«НН»: Для каго гэты запіс будзе цікавы найперш?**

**Слава:** Ён павінен спадабацца ўсім прыхільнікам добрай музыкі. Ёсьць там цяжкія хард-рокавыя моманты, ёсьць песьні лягчэйшыя, перазапісана колькі старых гітоў.

**«НН»: Кася, некалькі гадоў таму Вы зазначалі, што беларуская паэзія спыніла сваё разьвіцьцё. Таму, маўляў, і новых песень у «Новага неба» няма. Сочыце цяпер за паэзіяй?**

**Кася:** Адкрыцьцяў апошнім часам не было. Друкуецца няшмат, усё меней вершаў зьяўляецца на старонках «Нашай Нівы». Паэзія разьвіваецца паводле сваіх уласных законаў, і цяпер ня час паэзіі. Ейны час пакуль не прысьпеў.

**Слава:** У Касі ўся творчасьць была неад'емна зьвязаная з паэзіяй. Былі некалькі чалавек, што пісалі тэксты для «Новага неба». Тыя тэксты падабаліся і мне. Цяпер у гэтых людзей свае праблемы, а акром іх нікога няма. Часта чытаю паэтаў. Але, прабачце, там такі канструктывізм, язык можна зламаць пры чытаньні. Паэзія ж павінна быць мэлядычнай. Тым больш калі яна выкарыстоўваецца ў песенным жанры.

**«НН»: Кася, а самі пісаць не спрабавалі? Вось Корань пасьля ад'езду Фэлікса Аксёнцава ў Канаду сам піша тэксты для «Ўлісу».**

**Кася:** Ні ў якім разе! Думаю, калі б я пачала пісаць, выйшла б павучаньне. А паэт не павінен чытаць натацыі сваім слухачам.

**«НН»: Вашае жыцьцё пасьля сыходу са сцэны зьмянілася?**

**Кася:** Усё засталося на сваіх месцах. Беларуская рок-тусоўка вузкая, і за столькі гадоў ад яе можна стаміцца *(сьмяецца)*.

**«НН»: Ці варта чакаць адраджэньня «Новага неба»?**

**Кася:** Немагчыма сказаць, што будзе з «Новым небам» заўтра. Калі Глёбус прапанаваў такую назву для групы, спачатку яна мне ня надта спадабалася. Але потым я зразумела, што якраз гэтая назва дае магчымасьць гурту быць заўсёды новым.

**«НН»: Слава, часта ўдзельнікі «Басовішча» наракаюць на несправядлівае разьмеркаваньне ўзнагародаў. Як сябра журы, што скажаце?**

**Слава:** Усе прызы «Басовішча» роўныя. Няма адзінага пераможцы, іх некалькі. Таму ня верце тым музыкам, што кажуць: мы перамаглі на «Басовішчы». Быў бы першы прыз, я б даў яго гурту з Ольштыну — «Triquetra». Адзначыў бы й «Тарпач». Мне не падабаецца стыль, у якім граюць узнагароджаныя «IQ-48», але робяць яны сваю справу прафэсійна. Наагул, гэта было найлепшае «Басовішча» за апошнія пяць гадоў.

**«НН»: Можа, граць музыкі і сталі лепей, а вось сьпяваюць яны ні пра што... Чаму сацыяльная тэматыка зьнікае зь песьняў?**

**Кася:** Гэта ад стомы грамадзтва. Вострасацыяльнасьць надакучыла. А калі яна зьнікае, зьнікае і рок-музыка.

**Слава:** Выйшла падмена паняткаў, чаму паспрыялі розныя музычныя дзялкі. Яны вырашылі, што лепей сьпяваць лёгкія песьні ні пра што, тым самым забаўляць народ і зарабляць на ім грошы. Прадусарскі інстытут забівае рок.

**«НН»: І заб'е зусім?**

**Кася:** Так, беларускаму року будзе канкрэтны «гамбец». Калі ў мастацтве зьнікае шчырасьць — зьнікае ўсё.

**Слава:** Ні хвіга! Рок ня зьнікне, бо гэта стан душы. Сапраўднае застаецца.

**Гутарыў Сяргей Будкін**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Люстэрка

Уліс. (р) 2003

Нарэшце Слава Корань зрабіў альбом, які яго самога задавальняе.

«Люстэрка» дакладна разьбіваецца на дзьве часткі. Першыя 11 песень падобныя: гітарныя сола дэпрэсіўныя, вершы безвыходныя. Толькі ў песьні «Мы ўцякаем» спадзеў на лепшае: «Мы калі-небудзь вернемся і пабудуем палац нашых мар». Пэрсанаж «Люстэрка» расьціснуты «Гэтым горадам», стомлены марнымі пошукамі свабоды («Ты»). Праз гэта ён згубіў розум («Вар'ят») і цяпер займаецца самападманам («Я танчу»). Псыхалягічна.

А вось у другой частцы (восем песьняў) спрэс гіты. Тут клясычныя «Кругі на вадзе», «Краіна доўгай белай хмары», «Радыё «Свабода» ў новых аранжыроўках. Тры песьні на вершы Караткевіча (шыкоўныя!) былі зробленыя для «Скрыпкі дрыгвы» — чарговага супольнага праекту. Але, відаць, усе яго ўдзельнікі павыдаюць тыя песьні на сваіх альбомах.

Не праходзіць незаўважанай песьня «Апавяданьне пра маю вуліцу» — гіт! Корань-вакаліст заўважна прагрэсуе.

**СБ**



# Рэпэртуар для «Санаты-FM»

## Якім можа быць рэпэртуар айчыннае FM-станцыі з клясычнай музыкай

Слухаючы час ад часу айчынныя FM-станцыі, чалавек ня можа не заўважыць некаторых зьменаў. Я не кажу пра зьнікненьне апошняй беларускамоўнай хвалі і замену яе на нейкі безаблічны «Радиус». У этэры стала заўважна больш музыкі, якой раней практычна ніколі не было. І падаюцца гэтыя 50% пад назваю «беларуская музыка». Тут і Барыс Маісееў, і Аляксандар Саладуха, і група «Краскі» і да т.п.

Калі ўявіць сабе гіпатэтычную станцыю з клясычнай музыкай (назавем яе, прыкладам, «Саната-FM») і паставіць перад ёй сучаснае патрабаваньне (50% беларускага гучаньня), дык узьнікнуць вялікія цяжкасьці. Ёсьць многа цудоўнай беларускай музыкі: і сымфанічная, і камэрная, і харавая, ёсьць і арганныя творы, і фартэпіянныя, і акадэмічныя творы для народных інструмэнтаў. Я б нічога ня меў супраць, калі б можна было штодня слухаць творы Смольскага, Солтана, Гарэлавай, Хадоскі... Але тут ёсьць адзін аспэкт: у айчыннай музыцы няшмат «шлягераў», таго, што прыцягвала б большую слухацкую аўдыторыю, рэкламадаўцаў, прадусараў. Такіх шлягераў, як «Танец маленькіх лебедзяў» ці «Палёт валькірыяў», як арыя Фігара ці Першы канцэрт Чайкоўскага. Мне сходу прыгадваецца хіба Палянэз Агінскага ды фрагмэнты з «Маленькага прынца» Глебава.

Аднак калі кіравацца такой самай лёгікай, як і нашыя папсовыя дыджэі, дык фармальна можна лічыць беларусамі тых самых Манюшку, Мусаргскага ды Глінку, Стравінскага ды Шастаковіча. Чаму б ня ставіць у этэр опэры «Галька» Манюшкі й «Барыс Гадуноў» Мусаргскага, чаму б не лічыць беларускай арыю Сусаніна ці «Ленінградзкую» сымфонію Шастаковіча? Прынамсі, гэта такая ж «беларуская» музыка, як і «Голубая луна» ў выкананьні Барыса Маісеева.

Атрымліваецца чыста тэрытарыяльнае разуменьне «нацыянальнага мастацтва». Я з такім сутыкнуўся на занятках з канцэртмайстарскага майстэрства ў Акадэміі музыкі. Тутака раз на год сярод мноства твораў кожны студэнт мусіць выканаць абавязковы раманс ці арыю беларускага кампазытара. Часьцей за ўсё гэта бывае які-небудзь невялічкі рамансік «мясцовага» кампазытара на словы Пушкіна ці Бродзкага, часам — на словы Шэксьпіра або Гайнэ, але абавязкова па-расейску. З гэткім самым посьпехам можна было б выконваць творы смаленскіх ці разанскіх, карацей — «рэгіянальных» кампазытараў. Іншага ж і не патрабуецца. Студэнтам і ілюстратарам няма як упэўніцца ў сьпеўнасьці роднай мовы. Аднойчы я пачуў ад сваёй выкладчыцы, што нават гучаньне беларускай мовы ў яе «выклікае агіду». Гэтак я быў агаломшаны, калі пачаў з захапленьнем распавядаць пра праект выданьня знакамітых вакальных цыклаў Шубэрта зь беларускім перакладам тэкстаў Васіля Сёмухі.

Радыёстанцыя й канцэртная заля — зусім розныя рэчы. На канцэрце ніхто ўжо ня можа запатрабаваць ад Робэрта Планта засьпяваць палову песьняў па-беларуску. У канцэртах з акадэмічнае музыкі дык і зусім свабода. Выканаўцы вольныя граць пераважна творы заходнеэўрапейскіх кампазытараў дзе заўгодна: у Японіі ці Мэксыцы, у ЗША ці Аўстраліі. Ліцэйскі настаўнік кампазыцыі Кім Цесакоў не стамляўся казаць нам: «Вы — бе-ла-рус-кі-я піяністы. Таму ў вашым рэпэртуары заўсёды павінна быць адно аддзяленьне з твораў беларускіх кампазытараў». Унутрана я зь ім і пагаджаўся і не пагаджаўся. Трэба сказаць праўду: у неабсяжным сьпісе сусьветных шэдэўраў, напісаных для фартэпіяна, няма твораў беларускіх кампазытараў. А той, хто хоча складаць канцэртныя праграмы, тым больш — брацць удзел у міжнародных конкурсах, мусіць граць пераважна шэдэўры.



IREX-PROMEDIA

Іншая рэч, што клясычная музыка значна менш зьвязаная із словам, чым сучасная песенная культура. Клясычная музыка куды больш унівэрсальная й абстрактная. Што не замінае адшукваць шмат украінскіх ці арабскіх матываў у творчасьці Чайкоўскага ці Балакірава адпаведна.

Значна больш лягічным было б на ўяўнай клясычнай FM ставіць многа зусім розных твораў у выкананьні айчынных музыкаў. І гэта таксама рабіць было б вельмі цяжка: мала якасных запісаў. Тады паўстала б неабходнасьць, каб гэтых запісаў рабілася больш і больш. І яшчэ. Пры любым раскладзе клясычнаму FM ніяк не пагражала б засільле амэрыканскай музыкі. Дык ці не было б гэта прывабным для цяперашніх уладаў? Тое самае адбываецца ўжо цяпер з папулярнай музыкай: патрэба ў якаснай добрай беларускай музыцы мецьме вынікам ажыўленьне музычнага бізнэсу.

**Віталь Стахіевіч**

# «Arche» забараняюць

У ліпені падчас «Славянскага базару» намесьніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч, заўважыўшы часопіс «Arche» ў віцебскай кнігарні, зрабіла разнос кіраўніцтву тамтэйшага «Аблкнігагандлю». «Хоць часопіс і мае ліцэнзію на рэалізацыю, службовыя асобы мусяць разумець, дзе і чым варта гандляваць», — гэтак перадае яе словы адзін з супрацоўнікаў кнігагандлёвае канторы.

Амаль адначасова прадаваць часопіс адмовілася менская «Акадэмкніга». Дырэктарка кнігарні Соф'я Жыбулеўская тлумачыць сытуацыю тэхнічнымі прычынамі: «У нас мала плошчаў, нават для кніг малавата. А часопісы можна лёгка купіць у «Белсаюздруку». Таму мы прынялі рашэньне пазбавіцца ўсіх часопісаў, апрача «Роднага слова» і «Вестак Акадэміі навук». Будзем рабіць упор на навуковыя выданьні». Гэтаму пярэчыць распаўсюднік «Arche» Алесь Яўдаха: «Зайдзеце ў гэтую кнігарню — і пабачыце там прынамсі пяцьдзесят беларускіх часопісаў. Для нас такая адмова — непрыемны ўдар, бо «Акадэмкніга» была лідэрам у продажах часопісу: там прадавалася асобнікаў сто кожнага нумару». Са словаў Алеся Яўдахі, рынак адрэагаваў на забарону павелічэньнем продажаў праз шапікі «Белсаюздруку» і ў незалежных распаўсюднікаў.

**Аркадзь Шанскі**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Футбол — за Ліцэй

**24 жніўня на стадыёне «Вымпэл», што ў парку Чалюскінцаў, ліцэйская грамада ладзіць футбольны турнір.** Удзел у турніры маюць узяць дзесяць камандаў зь Менску й Барысава. «Гаспадары»-ліцэісты зьбіраюцца выставіць аж тры каманды: зборныя сёлетніх і леташніх выпускнікоў, а таксама каманду малодшых ліцэістаў. Зборная выкладчыкаў ліцэю на поле ня выйдзе: яе капітан Лявон Баршчэўскі ў ад'езьдзе. Пераможца турніру атрымае прыз — Кубак «За ліцэй». Таксама кожная з трох камандаўфіналістак атрымае па скрыні піва. Калі выйграюць ліцэісты, піва дастанецца гледачам.

### Ізноў Арлоў

**Каго ўзнагароджваюць ордэнам Белай Мышы?** Чаму белыя мядзьведзі зьелі менавіта расейскую дзяўчынку Машу? Ці бываюць чарвівыя мандарыны? Што можа здарыцца зь беларускім падарожнікам, які выправіцца ў Чэхію па сьлядох князя Жыгімонта? Пра гэта дапытлівыя чытачы змогуць даведацца ў аўторак 26 жніўня ў сядзібе ТБМ (вул. Румянцава, 15), падчас чарговае (але юбілейнае, пісьменьніку — 50 гадоў) сустрэчы з Уладзімерам Арловым. Аўтар дае аўтографы. Зьміцер Бартосік сьпявае. Алег Трусаў кіруе. Калі ня маеце часу 26-га, прыходзьце ў чацьвер, 28 жніўня. Пачатак а 18 гадзіне.

# Каму не чужыя Беларусь і мастацтва

Алесь Мара. Аўтаманаграфія. — Менск, 2002.




Зьмест гэтага выданьня вызначыць цяжка. Невыпадкова сьпісу таго «зьместу» і няма ні ў пачатку, ні пры канцы кнігі. Але ў ёй ёсьць жывапіс і паэзія, графіка й публіцыстыка, радкі зь дзёньнікаў і сямейныя фатаздымкі. Аляксей Марачкін, распавядаючы пра сябе й сваю творчасьць у вольным, размоўным кшталце, запачаткаваў новы жанр. Гэта першая ў Беларусі мастакоўская манаграфія, укладзеная й выдадзеная самім мастаком. Нехта дзякуючы ёй адкрые для сябе Марачкіна як тонкага каларыста ці малявальшчыка, нехта — як публіцыста-патрыёта ці паэта, а нехта — і проста як чалавека — сына, бацьку, дзеда...

Гісторыя мастацтва — найперш людзкія біяграфіі, лёсы творцаў. І іхныя чалавечыя лёсы могуць быць ня менш вартымі, чым мастакоўскі даробак. Асабістая біяграфія мастака можа стаць люстрам пакаленьня. А разам з фрагмэнтамі лёсаў тых, хто яго атачаў, ствараецца й велічная карціна эпохі. Аляксей Марачкін праз фарбы ўласнае біяграфіі складае пярэстую мазаіку мастацкага, культурнага, палітычнага жыцьця нацыі. Таму сама гэтая кніга ёсьць перадусім найкаштоўнейшым дакумэнтам, бо паміж аўтарам і чытачом (гледачом) няма пасрэдніка ці інтэрпрэтатара.

Аўтар кнігі ўвайшоў у нашае мастацтва ад 70-х, разам з цэлым пакаленьнем мастакоў, якое сталася абуджальнікам нацыянальнае сьведамасьці. Адлік іхнае структураванае дзейнасьці можна весьці ад 1976 г., калі адбылася выстава да 100-годзьдзя з дня нараджэньня Цёткі. Гэтак нараджалася найноўшая беларуская клясыка. Калегі, паплечнікі й сябры з кола Марачкіна прыцягнулі ў культурны ўжытак багата новых сюжэтаў і павярталі зь нябыту старыя. Вярталіся й колішнія жанры, гэткія, напрыклад, як маляваныя дываны альбо «сармацкія» партрэты. І ў тых экспэрымэнтах браў чынны ўдзел Марачкін. Гэтак вынаходзілася арыгінальная пластычная мова, якой прамаўляла жывая беларушчына. Адметны й пазнавальны стыль Марачкіна — ужо клясыка сёньня. А як ён паўставаў, зь якіх паіўся крыніцаў, можна вычуць, разгарнуўшы манаграфію.

Гістарычныя сёньня партрэты Луцкевіча, Дуніна-Марцінкевіча, Вітаўта, тузіна іншых гістарычных пэрсанажаў, народжаныя пэндзлем Марачкіна, уважаюцца за хрэстаматыйныя. Іх ведае ці прынамсі бачыў кожны беларус. І пазьней, і да сёньня, заўсёды Беларусь для Аляксея Марачкіна — і аб'ект, і сутнасьць творчасьці. Таму й патас ягоны гучыць цалкам натуральна: «Нас яднае і лучыць вера ў тое, што мы самі ня зломкі навесьці парадак у нашым Доме. Імя якому — Беларусь».

Усё самае істотнае, што адбывалася ў краіне, адбівалася ў творчасьці мастака: навала Чарнобылю, перастройка, здабыцьцё незалежнасьці, чарговая навала вандалаў і хамаў...

Гэтае выданьне — партрэт Беларусі, яшчэ адзін зь нізкі партрэтаў, створаных мастаком. Але кніга Марачкіна менш за ўсё падобная на творчую справаздачу альбо на летапіс ягоных летаў. Няма тут ані жорсткае храналёгіі, ані падбору твораў па «этапах» ці «пэрыядах». Глянцавыя старонкі пераносяць нас у сьвет перажываньняў, а не перажытага. Тут — балючыя радкі зь дзёньніка, тут — брутальная палітычная карыкатура альбо, наадварот, цалкам лірычны, інтымны твор. Новай форме выкладу адпавядае й нетрадыцыйная форма афармленьня кнігі. Рэпрадукцыі й тэксты зьнітаваныя ў сынкрэтычны самастойны твор самім арыгінальным макетам. Аздобу выданьня выканаў Ігар Марачкін, сын аўтара й ягоны суаўтар. Аляксей Марачкін адмыслова падкрэсьлівае гэтую пераемнасьць, надае шмат увагі сям'і, бо бачыць у ёй не адно вытокі ўласнае біяграфіі, але й яе працяг. Сваімі ўласна эстэтычнымі й паліграфічнымі якасьцямі гэтае выданьне моцна вылучаецца на цяперашнім тле беларускага кніжнага рынку, выломваецца зь яго. Аднак яно разьлічанае не адно на адмысловаў ці аматараў мастацтва, яго адраснасьць куды шырэйшая. Яно разьлічанае на тых, каму не чужыя Беларушчына й Мастацтва.

**Сяргей Харэўскі**

**Прайшло ўжо больш году ад таго часу, калі ў Гомелі выйшаў першы нумар часопісу «Інвэнтар». Ідэя яго стварэньня ўзьнікла ў асяродку краязнаўчай арганізацыі «Талака» і кампаніі вольных мастакоў. Галоўны рэдактар часопісу і кіраўнік «Талакі» — Яўген Малікаў. Часопіс вылучаецца сярод іншых рэгіянальных выданьняў вялікай колькасьцю аўтарскіх малюнкаў і фатаздымкаў, штостаронкавымі фотазастаўкамі, нязвыклым фарматам і дызайнам.**

# Гомельскі «Інвэнтар»




Пра што пішацца ў «Інвэнтары»? Ён адкрываецца артыкулам самага аўтарытэтнага гомельскага археоляга Алега Макушнікава. У Гомелі цягам апошніх дваццаці гадоў актыўна праводзіліся раскопкі. Толькі на дзядзінцы, вакольным градзе і пасадзе археолягі вывучылі каля 3500 кв.м культурных напластаваньняў гораду! Паводле А.Макушнікава, ужо ў XII ст. фэадальны Гомій прасьціраўся больш чым на 45 га. Для параўнаньня нагадаю, што ў той самы час плошча Верхняга Замку ў Полацку дасягала 10 га, а Вялікага пасаду — 50 га. Вялікая ўдача гомельскіх археолягаў — адкрыцьцё дому-майстэрні збройніка пачатку XIII ст. Сярод іншых рэчаў там была знойдзеная драўляная міса з кірылічным надпісам, які сьведчыць, што яна належала гаспадару, збройніку Хведару.

Якім быў і якім павінен быць гарадзкі герб Гомелю? Пра гэта піша ў «Інвэнтары» Андрусь Саладоўнікаў. Ад часу ўключэньня Гомелю ў склад Расейскай імпэрыі стары герб — срэбны крыж на чырвоным полі, які атрымалі месьцічы ад Жыгімонта Аўгуста, быў зьменены на рысь («ибо таковых зверей в окрестностях сего города вельми много») у спалучэньні зь дзьвюхгаловым арлом. У 1997 г. выява рысі, з ініцыятывы райвыканкаму, была зацьверджаная ў якасьці афіцыйнага гербу Гомелю. Але чаму не старажытны срэбны крыж?

Юры Глушакоў на старонках «Інвентару» не без сымпатый да герояў свайго нарысу апавядае пра гомельскую арганізацыю эсэраў, якая брала ўдзел у замаху на Пятра Сталыпіна. У 1906 г. выхадцы з Гомелю Іван Ціпункоў і Эля Забяльшанскі з крыкам «Да здравствует анархия!» падарвалі сябе і пяцярбурскае лецішча Сталыпіна.

Што і як ахоўваць у Гомелі? Яўген Малікаў разважае пра ініцыяваную «Талакой» праграму. Талакоўцы найперш рупяцца пра ўнікальную драўляную забудову Гомелю канца XIX—пачатку XX ст., цэлыя кварталы якой захаваліся ў Спаскай слабадзе і Кагальным рове. Старыя квартальныя ансамблі драўляных будынкаў у спалучэньні з цэрквамі і іншымі гістарычнымі будынкамі, унікальная карункавая разьба, брандмаўэры — высокія глухія супрацьпажарныя каменныя сьцены канца XIX ст. паміж драўлянымі дамамі — маюць шанец увайсьці ў ахоўную гістарычную зону гораду. У далейшых плянах «Талакі» — стварэньне музэю драўлянай мяшчанскай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі. Ня выключана, што ідэю прытармозяць стэрэатыпныя ўяўленьні пра старую пабудову, пабачаную ў эўрапейскіх гарадах, а таксама неразуменьне паўднёва-ўсходняй беларускай адметнасьці. Памкненьне да захаваньня «старога Гомля» — сьведчаньне ўзрастаньня рэгіянальнага патрыятызму, веры ў сябе і свае сілы.

Фалькльёрны блёк складаецца з новых запісаў, зробленых у вёсках Фёдараўцы і Навілаўцы, дзе жывуць людзі зь дзіўным прозьвішчам «Дзеньдобрыя» (Сьцепаніда Дзеньдобрая), што захавалі звычай хаваць на Ўшэсьце ляльку-«вясну», а праз год на Зьвеставаньне адкопваць яе. Ларыса Раманава піша пра духоўныя вершы і псальмы Гомельшчыны. Напрыклад, «Ой, Божа мой, Божа, з высокага неба» можна паставіць у адзін шэраг зь беларускім духоўным гімнам «Магутны Божа». «Ой, Божа мой, Божа, з высокага неба» сьпявалі па сьмерці чалавека.

Прапанаваны гомельцамі часопіс пакідае вельмі добрае ўражаньне.

**Мікола Крывальцэвіч**

# Гісторыя ў пэрыядах

Гістарычны альманах: Т. 7. — Горадня, 2002

Дасюль незарэгістраванае Беларускае гістарычнае таварыства здолела правесьці ўжо другую канфэрэнцыю «Праблемы пэрыядызацыі гісторыі Беларусі». Цяпер яно прапануе ўсім даведацца, што ж дзеялася ў Магілёве ў лістападзе 2001 г. «Альманах» зьмяшчае ня толькі прачытаныя даклады, але і стэнаграму дыскусій.

Гісторыкі разьбівалі на пэрыяды эканамічную, этнічную гісторыю, гісторыю культуры, дзяржавы і права Беларусі, гісторыю гістарыяграфіі. Нават былі знойдзеныя яшчэ больш дробныя прадметы, падлеглыя пэрыядызацыі: гісторыя міліцыі (Іван Саракавік), нацыянальна-вызвольны рух у Заходняй Беларусі (Аляксандар Вабішчэвіч), палітычныя рэпрэсіі ў 1917—1952 г. (Ігар Кузьняцоў).

Самым усёабдымным быў даклад Аляксандра Краўцэвіча па этнічнай гісторыі Беларусі. Гісторык адразу ўстанавіў тры асноўныя вяхі: VI ст. н.э., сярэдзіна XIII ст. (каля 1248 г.), 25 сакавіка 1918 г. Гэта «пазытыўныя» даты. Аднак у канцы дакладу А.Краўцэвіч устанавіў яшчэ дзьве вяхі: 1569 г. («нэгатыўная») і сярэдзіна XIX ст. (пачатак беларускага адраджэньня). Чаму пра іх не было адразу заяўлена?

Эканамічную гісторыю Беларусі Валянцін Голубеў разглядзеў вачыма аўтараў навучальнага дапаможніка «Эканамічная гісторыя Беларусі», якія разьбілі свой прадмет на 18 пэрыядаў. В.Голубеў у цэлым пагадзіўся з такой пэрыядызацыяй. Затое Андрэй Кіштымаў прапанаваў вылучыць пэрыяды аграрнай і індустрыяльнай эканомікі, а паміж імі — этап індустрыялізацыі. Цікава было б даведацца, калі ў нас гэты этап пачаўся і калі скончыўся — і ці скончыўся ўвогуле.

У гісторыі беларускай культуры Сьвятлана Куль-Сяльверстава бачыць восем пэрыядаў. У яе пабудовах паміж Рэнэсансам і Асьветніцтвам утварылася пустата з храналягічнымі рамкамі ад сярэдзіны XVII да сярэдзіны XVIII ст. Як называць культуру гэтага часу — ці барока, ці сармацкай культурай?

Рэлігійная гісторыя стала аб'ектам разгляду Сьвятланы Марозавай. У яе ўяўленьні Беларусь была паганскай да канца X ст., хрысьціянскай — усё 2-е тысячагодзьдзе, у XX ст. стала атэістычнай, а на пачатку XXI-га адбыўся рэлігійны «рэнэсанс».

Нарэшце, быў на канфэрэнцыі адзін гістарыясофскі даклад (Генадзь Сагановіч) пра кантынуітэт і дыскрэтнасьць у гісторыі. Гэта, вядома, «не па тэме», але дадае нейкую саліднасьць імпрэзе.

Гістарычная пэрыядызацыя, як было заяўлена на канфэрэнцыі, справа вельмі суб'ектыўная, а ня дадзеная звыш. А што дадзена? Мо той самы «савецкі» 1917 год, які ў прыхаванай форме («пачатак XX стагодзьдзя») прысутнічаў у большасьці пэрыядызацыяў? Добра, што быў там і яшчэ адзін «вечны год» — 1991.

**Валеры Пазьнякоў**

# Кніжкі пані Смулковай

Elżbieta Smułkowa. Białoruś i pogranicza. Studia o języku i społeczeństwie. — Warszawa, 2002. — 651 s.

Pogranicza języków. Pogranicza kultur. Studia ofiarowane Elżbiecie Smułkowej. — Warszawa, 2003. — 392 s.




Эльжбета Смулкова — выдатная польская лінгвістка, прафэсарка, былы пасол Польшчы ў Беларусі. Да 2002 г. загадчыца катэдры беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту. Э.Смулкова — дасьледчыца сумежжа народаў, моў, дзяржаў, культур. Асноўная частка прац Э.Смулковай пабудавана на матэрыяле польска-беларуска-літоўскага сумежжа.

Першая кніга — гэта зборнік прац Э.Смулковай, напісаных і апублікаваных у розныя гады. Другая — гэта зборнік навуковых прац, прысьвечаны 70-годзьдзю Э.Смулковай. Сярод аўтараў вядомыя беларускія дасьледчыкі: Г.Арашонкава, А.Жураўскі, А.Крывіцкі, А.Мальдзіс, Н.Мячкоўская, Г.Цыхун, А.Янушкевіч, І.Яшкін і інш.

**Фёдар Клімчук**

## ●НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ●

**Бахарэвіч А. Натуральная афарбоўка.** — Менск: Логвінаў І., 2003. — 228 с. 200 ас.

Гэтая кніга — другі зборнік прозы ляўрэата сёлетняга «Глінянага Вялеса» Альгерда Бахарэвіча. Сюды ўвайшлі сем апавяданьняў ды раман, напісаныя ў 2001—2002 г.

**Броўка П. Крыніца з-пад Вушачы:** Вершы і паэмы / Уклад. Р.Барадуліна. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 366 с.

Спадчына Петруся Броўкі паўстане перад строгім чытачом у новым, нечаканым ракурсе. Том склалі вершы й паэмы са зборнікаў «Між чырвоных рабін», «Калі ласка», «Ты — мая пчолка» й інш. Цана ў менскіх кнігарнях блізу 5000 руб.

**Неўдах Л. Бумэранг:** Аповесьці. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 184 с.

Творы, зьмешчаныя ў кнізе, — аб перабудове таталітарнага грамадзтва, ломцы «савецкага» сьветапогляду ды асабістых трагедыях на гэтым грунце. Героі аповесцяў — ахвяры працэсаў, што адбываліся ў 1990-я. Пытайцеся ў «Акадэмкнізе».




**Чарняўскі М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны пэрыяд.** — Менск: Выд. цэнтар БДУ, 2003. — 144 с.: іл. — (Scriptor universitatis). Накл. 1000 ас.

Выдатная кніга для школьнікаў сярэдняга веку. Даведацца, дзе й калі на тэрыторыі нашае краіны ўзвышаліся горы, як на Палесьсі палявалі на паўночных аленяў, кім былі, у што апраналіся й як вялі гаспадарку далёкія продкі беларусаў, можна з дапамогай гэтай багата ілюстраванай кнігі. Храналагічны ахоп — ад першапачатковага засяленьня краю ў ледавіковы пэрыяд й да эпохі Вялікага перасяленьня народаў. У дадатку — вытрымкі з фальклёрных твораў, а таксама з прац старажытных гісторыкаў ды геаграфаў, дзе адлюстраваныя зьвесткі пра першабытнае мінулае Беларусі.

**Тацяна Вабішчэвіч, Андрэй**

# Будзе нам утульным канадыйскі пэчварк



Гурт «Яваровы людзі»

Сьпеўная група — ня проста адзінка самадзейнасьці. Калі тарантаўская парафія страціла сьвятароў і службы пачалі адбывацца нерэгулярна, група стала цэнтрам беларускіх вячорак.

А ў Канадзе скончыўся сэзон дажджоў… і пачаўся сэзон фэстываляў. І вось ужо ўзьлятаюць у неба кітайскія языкатыя цмокі, імчаць навыперадкі філіпінскія шматвёславыя чаўны, маршыруюць галаногія шатляндцы ў клятчастых спадніцах, дудзяць афрыканскія барабаны, скачуць у бразыльскай румбе тарантаўцы...

Фальклёрна-этнічныя фэстывалі сталі ня проста характэрнай асаблівасьцю Канады. Шматнацыянальная яе сутнасьць нагадвае тутэйшую стракатую коўдру «пэчварк», ва ўзоры якой кожны этнас займае сваё адметнае месца. Гарманічны, мудрагелісты арнамэнт! Так прыемна ўсьведамляць, што ў гэтым сусьветным калейдаскопе ёсьць і наша беларуская культура. І мы маем што паказваць і чым зьдзіўляць народ.

...Роўна два гады таму Віялета Кавалёва, толькі прыехаўшы ў Таронта, напісала: «Краіна гэта — амаль уся наша плянэта ў мініятуры. Тут ёсьць свой вялікі «Чайнатаўн», шматлікія польскія крамы, украінскія цэрквы, расейскія газэты, габрэйскія дантысты, нямецкія духавыя аркестры і лацінаамэрыканскія карнавалы... Тут няма, на жаль, амаль нічога беларускага, шырока вядомага па-за межамі ЗБК». ...А вось цяпер, праз два гады, газэта «Беларускае слова», што пад яе рэдакцыяй, разыходзіцца з паліцаў украінскіх і расейскіх крамаў у лічаныя дні. А 21 чэрвеня павезла Віялета сваіх «Яваровых людзей» на фольк-фэстываль аж у Кітчэнэр.

Калі ўжо гартаць хроніку назад, дык можна прыгадаць, што менавіта Кітчэнэр тады, два гады таму, стаў месцам нараджэньня нашага фолькгурту, а з гэтым — і пунктам адліку ў жыцьці тарантаўскіх беларусаў.

А пачалося ўсё з таго, што, дзякуючы асабістым сувязям і намаганьням сп.Вікторыі Ціханоўскай, тамтэйшая расейская суполка запрасіла нас на мясцовы фэстываль і па-сяброўску падзялілася 15 хвілінамі свайго часу для выступу ў канцэрце. На што старшыня ЗБК Надзея Дробіна проста ўзмахнула рукамі: «А што ж паказвацьмем?» Як заўсёдны «генэратар ідэй», пачала яна шукаць па арудах таленты: а хто ж тут у нас іграць-пяяць умее? І менавіта ў гэты час і прыехала Віялета. Яна пачала ненавязьліва, але пераканаўча прыводзіць да дысцыпліны нашу стыхійную, неарганізаваную групу энтузіястаў (трэба сказаць, усе з радасьцю ўсклалі на яе адказнасьць).

Часу для рэпэтыцыяў бракавала. Затое імпэту колькі было!

...На лужок перад гледачамі, мінаючы адмыслова падрыхтаваную сцэну зь мікрафонамі (бо яна не ўмясьціла б усіх), мы выйшлі, лічы, усёй суполкай, зь дзецьмі і старэйшымі сябрамі, у зробленых на хуткую руку строях і зь бел-чырвонабелымі сьцягамі...

Посьпех быў настолькі ашаламляльны, што цяпер мы маем адмысловыя запрасіны да ўдзелу ў фэстывалі ад яго арганізатараў.

Але ў той дзень, позьнім вечарам на банкеце, наладжаным сябрамі-расейцамі, усё яшчэ ўзбуджаныя гэтым нечаканым фурорам больш, чым віном, мы раптам вырашылі: а давайце зьбірацца штотыдня і сьпяваць! І хто мог тады сабе ўявіць, чым гэта ўсё абернецца.

Сьпеўная група стала ня проста адзінкай самадзейнасьці. Ва ўмовах, калі тарантаўская парафія страціла сьвятароў і службы пачалі адбывацца нерэгулярна, група стала цэнтрам нашых пасядзелак-вячорак. Штотыдня людзі сустракаюцца, гутараць, гуртуюцца, справы робяцца, жыцьцё ідзе.

З таго часу ў гурце зьмянілася амаль увесь ягоны склад, цяпер тут бальшыня моладзі, што вельмі радуе. Маладзёны цягнуцца да гурту, а з тым уліваюцца ў жыцьцё Згуртаваньня беларусаў Канады. Для іх гэта і забава, і талака, і пачуцьцё абуджэньня нечага дарагога і сьвятога. Магічныя нашыя старажытныя песьні: аднойчы іх пачуўшы, тым больш засьпяваўшы — ужо не забудзеш і не пакінеш.

Зьмяніліся, сталі больш дасканалымі строі, пастаянна абнаўляецца рэпэртуар, у які ўваходзяць старыя, нават старажытныя песьні. «Яваровы людзі» ўдзельнічаюць ва ўсіх сьвятах і імпрэзах, што ладзіць Згуртаваньне, езьдзяць з канцэртамі да беларусаў у іншыя гарады.

«Віялета, а ці магла ты сабе ўявіць, калі выпраўлялася ў Канаду, чым ты там будзеш займацца?» — «З усяго, што ўяўляла пра Канаду, толькі гэта і спраўдзілася...»

...І вось зноў Кітчэнэр. Усё той жа Victoria Park у цэнтры гораду, тая ж сцэна. Да пачатку канцэрту публіку забаўляе, як і летась, нямецкі духавы аркестар (горад некалі засналі немцы, раней ён называўся Бэрлін). У праграме канцэрту ўкраінцы, грэкі, пуэртарыканцы, самалійцы, шрыланкійцы... Нашыя дзяўчаты ў строях адразу прыцягваюць агульную ўвагу. Людзі падыходзяць, распытваюць, хто мы і адкуль. Нашая касьцюмы бадай што самыя прыгожыя, людзі кажуць, што такога ніколі ня бачылі. Гэта яшчэ што!.. А вось і выступ, першы ў праграме. ...Я назіраю за рэакцыяй гледачоў: адкрытыя вочы і рты, на замерлых тварах зьдзіўленьне, захапленьне. Потым пачынаюць адстукваць рытм ногі, пляскаць рукі... Я ўжо ведаю гэтую рэакцыю, гэты першы шок. Сапраўды, зараз акрамя «amazing!» яны нічога больш сказаць няздольныя.

Мая канадыйская каляжанка Сьюзан Глоб, якой я даю слухаць дыскі з нашай фальклёрнай музыкай, гаворыць: «Калі я ўпершыню пачула музыку Беларусі, я была ашаломленая рэхам барабаннага бою канадыйскіх індзейцаў. Першыя гукі агортваюць тваё сэрца, рытм нарастае, ён падхоплівае тваё сэрца і цябе і нясе на зьяднаньне з страсьцю сьпевакоў... Я заўважаю, што мае сьцёгны рухаюцца, і я чакаю, што вось зараз сьпевакі паведамяць мне нешта патаемнае. Я не разумею слоў, але адчуваю, як гукі гэтыя ўзьнімаюцца з глыбіні зямлі і пахнуць агнём. Яны чаруюць мяне... Як можна словамі сказаць, што адчувае маё цела, калі яно ў экстазе?»

А Лінда Вандэр Ступ, удзельніца індзейскага фолькгурту, не знаходзіць у нашых песьнях падабенства з індзейскімі: «Хутчэй мэлёдыка песень падобная да ірляндзкіх, як і музычныя інструмэнты. Як сьпявачка, я бачу ўнікальнасьць у надзвычайнай гармоніі, у гэтым шматслойным спалучэньні мужчынскіх і жаночых галасоў, якія твораць рытм песьні нават без інструмэнтаў. Ніколі ня чула такой манеры, калі ўдзельнікі ўступаюць не адначасова. І гэтыя канцоўкі музычнай фразы: то працяжныя, то раптоўны абрыў зь нейкімі трукамі ў голасе — гэта майстэрства! Колькі моцы, свабоды, пяшчоты, любові... як быццам з сэрца самой зямлі!» ...Музыка дапамагае нам дзяліцца супольнымі каштоўнасьцямі і вучыцца адно ў аднаго.

Фэстываль — гэта ня толькі канцэрт. Па ўсім парку стаяць палаткі, сталы, дзе можна пабачыць і набыць безьліч дзівосаў і цудаў, створаных майстрамі з усіх канцоў сьвету. Індзейскія «дрымкатчары» («лаўцы сноў»), узбэцкія цюбяцейкі, эгіпецкія папірусы, пэруанскія губныя гармонікі, пэрсыдзкія бранзалеты, афрыканскія гляні... Нас прываблівала выстава пакістанскіх вырабаў з оніксу. Доўга круціла я ў руках прыгожыя фігуркі і пацеркі, размаўляла з майстрамі, а думкі мае блыталіся з пытаньнямі. Няма тут беларускай яткі, а як бы дзівіліся людзі нашай вышыўцы, саломцы, кераміцы... Раптам успомніла: у мяне ж з сабой бурштынавыя пацеркі (ад майго строю, яшчэ маміны...). «Хлопцы, а ці ведаеце вы гэткі камень?» — «О, прыгожа! Які лёгкі! Ці ж гэта камень?» Я тлумачыла, а яны глядзелі на мяне няўцямна... «О, бой! Я ж чуў пра гэта! Смала сасны! Амбэр. Вось як яно выглядае. Адкуль гэта?» — «Зь Беларусі». — «Беларусь? Ага, хакейная каманда! Прызнацца, я толькі на Алімпіядзе пра Беларусь і пачуў».

Падаліся дамоў, ідзём міма «харчовых радоў»: каўкаскія шашлыкі, карэйскія разнасолы, бэльгійскія вафлі, японскія сушы… «Віялета, уяўляеш, а як бы тут нашыя дранікі з мачанкай…» — «А хто рабіцьме? Нас на ўсё пра ўсё два дзясяткі чалавек, і так ужо кожны і жнец, і швец. Ат, кінь».

Цудоўны горад Кітчэнэр. А можа, нашыя майстры, кулінары, камэрсанты ўжо едуць да нас?

...Сонца ўзьнімалася ўсё вышэй. Скончаўся чэрвень — сэзон дажджоў.

Гарачае лета ахутвае, укрывае сьпякотнай коўдрай Канаду. І кружацца, закружваюць яе каляровыя карнавалы. Сэзон фэстываляў у разгары.

**Ірына Верабей, Таронта**



**Вэтэран нацыянальнага руху Кастусь Акула (у цэнтры) цешыцца за Віялету Кавалёву, ініцыятарку стварэньня «Яваровых людзей» і ейнага мужа Вячаслава, які дапамагае жонцы ў яе грамадзкай дзейнасьці.**

Лявон Вольскі



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

# Міларусь

Надоечы Кастусю прапанавалі паўдзельнічаць у працы Беларускага кангрэсу прагрэсіўных сіл. Кастусь пагадзіўся. Ён старанна адпрасаваў (гэта каштавала намаганьняў, бо Кастусь прасаваў кепска, не было яму гэта дадзена й заўсёды займала шмат часу) свой набыты пасьля войска румынскі гарнітур. Гарнітур, хоць і надзяваўся рэдка, з нагоды дня нараджэньня ці сустрэчы выпускнікоў, выглядаў неяк нясьвежа. Кастусь прасаваў, нэрваваўся, а мама раз-пораз заводзіла сваю ўстылую песьню:

— Табе ўжо за трыццаць, а ты ўсё бегаеш-носішся. Вот куда ты сабраўся січас? Я знаю куда. На еты свой кангрэс. А каму ад яго польза? Нікаму. Адна балталогія. Пасадзяць цябе, Косьця, за етую нікаму ня нужную балталогію.

Мама гаварыла, а ейны малаасэнсаваны позірк нагадваў Кастусю пагляд птушкі.

— Успакойся, — звыкла паўтараў напружаны Кастусь, а маці ўсё гаварыла й гаварыла, і ейны голас ператвараўся (якім ужо разам) у звыклае тло для ягонага жыцьця.

— …Я ў цібя спрашываю! Косьця! — раптам выплыла з шэрае каламутнае слоўнае плыні.

— Успакойся, — азваўся Кастусь і пацягнуўся ў свой пакой апранацца.

Кангрэс адбываўся ў ДК управы работнікаў бытавое абслугі насельніцтва (УРБАН). Люду сабралося шмат. У акулярах, барадатыя, кудлатыя, мастакі, музыкі, спартоўцы, літаратары — усе былі тут. Кастусь зарэгістраваўся (даваўся адстаяць немалую чаргу), атрымаў тэчку з матэрыяламі кангрэсу і зайшоў у залю. Адразу ягоную ўвагу прыцягнуў транспарант над сцэнаю: «Продолжим курс на неуклонное повышение культуры обслуживания граждан!» Відаць было, што гэты красамоўны транспарант прыцягнуў увагу ня толькі Кастуся, бо з залі даносіліся воклічы: «Прыбярыце сатанінскія лёзунгі!», «Далоў антыбеларускую прапаганду!»

З трыбуны гучна гаварыў прамоўца.

— Нашай мастакоўскай фракцыі падаецца, што цяпер праблема найбольш палягае ў тым рэчышчы, што нашая краіна мае няправільную назву. Гэтая назва — Беларусь — наклікае на наш край беды, і час прысьпеў яе зьмяніць.

— Нашто гэта?! Дурнота! — крычалі дэлегаты з залі, але прамоўца ад фракцыі мастакоў няўмольна працягваў:

— Зрэшты, трэба, каб новая назва ня рэзала слых сярэднестатыстычнаму жыхару нашага краю. Каб не была занадта адрознай ад папярэдняе. Таму мы прапануем кампрамісны варыянт, — ён зрабіў паўзу. — Наш варыянт — Міларусь. І гучыць падобна да папярэдняга, і корань мае аптымістычна-пяшчотны — «Міла». Калі дэлегаты зьезду падтрымаюць нас, мы зьвернемся з афіцыйнымі прапановамі ў дзяржаўныя структуры.

Тут нават самыя скептычныя й радыкальныя дэлегаты задумаліся. Карыстаючыся часовай цішаю, да трыбуны прарваўся яшчэ адзін прамоўца.

— Наколькі правільна было пастаўленае пытаньне шаноўнымі калегамі! — ухваліў ён. — Усе гавораць «палітыка-эканоміка», а справа палягае на тым, што назва няправільная. Калі яе памяняць, дык, адпаведна, і жыцьцё памяняецца. Як раней мы пра гэта ня думалі! І цяпер нашая фракцыя спартоўцаў прапануе сваю назву нашае краіны — Веларусь. Сапраўды, вельмі шмат насельнікаў вёсак і мястэчак езьдзяць на роварах, так бы мовіць, падтрымліваюць спартовую форму, а пасьля зьмены назвы колькі маладых бела… веларусаў сядуць на ровары й паедуць па прасторах нашага прыгожага краю! Веларусь — гэта здаровы лад жыцьця, гэта зьнікненьне п'янства й алькагалізму, гэта наша будучыня. Дзякую!

Заля загула. Нехта крычэў «Гэта правакацыя!», хтосьці ажыўлена абмяркоўваў прапанову. Тады ажывіўся вядоўца, што дагэтуль маўкліва вывучаў дакумэнты кангрэсу.

— Я прапаную зрабіць наступным чынам, — прамовіў ён. — Калі яшчэ ёсьць зыходныя прапановы па зьмене назвы краіны, дык давайце іх адслухаем. А потым вынесем на галасаваньне. А тады новую назву, якая зьбярэ найболей галасоў, накіруем у адпаведныя інстанцыі. Дарэчы, прэзыдэнт краіны пасьля зьмены назвы адразу мусіць страціць сваё паўнамоцтвы, бо ён жа ж прэзыдэнт РБ, а калі будзе, напрыклад, Міларусь, давядзецца ініцыяваць новыя выбары — прэзыдэнта Міларусі. Наступны прамоўца, калі ласка.

— Я тут рэпрэзэнтую таварыства музычных дзеячоў, — пачаў наступны. — Мы таксама падумалі й вырашылі, што найболей нашай краіне спасуе назва Бэкарусь. Чаму? А вось чаму. Бэкар — гэта нотны знак. А яшчэ на музычным слэнгу гэта значыцца «пралёт». А паколькі за апошнія дзесяць гадоў мы, у адрозьненьне ад былых краінаў сацлягеру, праляцелі па поўнай праграме ў сацыяльным, эканамічным і палітычным пляне, мы прапануем да паляпшэньня становішча называць рэчы сваімі імёнамі. І пакуль мы ня вылезем з гэтае багны, называцца Бэкарусь. А потым ужо можна і Міларусь, і як хочаш...

«Гэта правакацыя!» — крычэлі з залі, але вядоўца спакойным урачаваным голасам запрасіў на сцэну наступнага аратара.

Выйшаў сівы дзядок. Нешта пачаў казаць, але задалёка ад мікрафона, нічога не было разабраць.

— Бліжэй да мікрафона! — весела закрычэла заля.

— ...Наша гаротная зямелька, — працягваў стары ўжо ў мікрафон, — шматпакутны наш край. Слязьмі паліты, крывёй... Тут пакутаваў наш селянін пад цяжарам непасільнае працы. Тут пакутаваў калгасьнік, гвалтам загнаны ў калгасы. Тут пакутаваў рабочы, сьпіваючыся ад роспачы... Колькі бедаў мы спаткалі толькі ў мінулым стагодзьдзі, а што казаць пра пазамінулае...

— Давайце бліжэй да тэмы, шаноўны спадар прамоўца, — умяшаўся кіраўнік, — бо ж мы так да ночы ня скончым.

— ...і ўсё гэта прымушае нас абраць нашай краіне горкую, балючую, але праўдзівую назву — Бедарусь. Мы, нашая фракцыя вэтэранаў вайны і працы, раіліся і сышліся на гэтай суровай, але справядлівай назьве. Настойваю на тым, каб яна была зацьверджаная!

У залі хто лаяўся, хто сьмяяўся, нехта звыкла крычэў: «Гэта правакацыя!»

Вядоўца заклікаў да цішыні.

— Калі ласка, паводзьце сябе культурна, — казаў ён. — Наступны прамоўца!

— Мы — людзі простыя, — пачаў прамову насамрэч просты дзядзька з чырвоным твар, загарэлым і звонку, і знутры. — Мы — усебеларускае аб'яднаньне птушкагадоўлі. Увазходзяць туды і фэрмеры, і калгасныя птушкаводы, і працаўнікі птушкафабрыкаў. Карацей, шмат нас. Самая, лічы, шматлюдная арганізацыя сярод прадстаўленых на гэтым кангрэсе. І прапанова нашая простая: назавем нашую краіну Белагусь. Вось падумайце, якая прыгожая птушка — гуска. Вось яна ляціць, грацыёзна й велічна, вось яна, таксама грацыёзна й велічна, плыве. А калі што, дык і пастаяць за сябе можа. Як зашыпіць! Як кінецца на ворага! Сапраўдны сымбаль нашай краіны!

— А чаму ня бусел? — не ўтрымаўся вядоўца.

— Таму што Белабусел гучыць непрыгожа, — сумленна адказаў птушнік. — Быў, праўда, варыянт «Белабусь», але там слова «бусел» не зусім чытаецца.

— Добра, наступны, калі ласка, — запрасіў кіраўнік, але раптам у праходзе зьявіліся постаці ў камуфляжным адзеньні.

— Гэта правакацыя! — закрычэлі з залі.

На сцэну выйшаў падпалкоўнік міліцыі.

— Прашу ўсіх пакінуць памяшканьне. Нам патэлефанавалі, што будынак замінаваны. Заўтра, пасьля таго як група сапёраў праверыць будынак на наяўнасьць мінаў, можаце працягваць паседжаньне.

— Але ў нас арэнда толькі на сёньня, — абурыўся вядоўца.

— Нічога не магу зрабіць, — стомлена азваўся падпалкоўнік.

Па залі распаўзьліся сапёры, сабакі і байцы спэцназу, якія настойліва праводзілі да выхаду незадаволеных дэлегатаў.

— Дайце нам хаця б рэзалюцыю прыняць! — абурыўся вядоўца. — Ад яе будзе залежаць і вашае далейшае жыцьцё!

— Ачышчаем памяшчэньне, — пачуў ён побач голас спэцназаўца, вядоўцу падхапілі пад рукі й пацягнулі на вуліцу.

Каля пад'езду сядзелі заўсёдныя Лёнік і Жэка — аднаклясьнікі Кастуся. Першы працаваў на трактарным, другі ўжо даўно прабіваўся нерэгулярнымі шабашкамі й падачкамі. Лёнік і Жэка расьпівалі танныя напоі ў сьвятле пад'езднага ліхтара.

— Садзіся да нас, Косьця, — запрасіў Жэка. — Лёнік прастаўляецца.

— Ты адкуль? — спытаўся Лёнік, калісьці неабыякавы да Беларускае справы.

— З кангрэсу.

— І што на тым кангрэсе? — працягваў пытаць Лёнік.

Кастусь падумаў, што распавядаць пра кангрэс — гэта нарывацца на спрэчкі ды лаянку, і вымавіў:

— А-а, нічога.

— Во! Праводзіце кангрэсы, а ў выніку — «нічога», — абурыўся Жэка. — Праядаеце толькі грошы. А ўсё як было, гэтак і застаецца.

— Ня лезь да яго, — абараніў Лёнік. — Хай хоць нешта адбываецца. Можа, штосьці й зьменяць.

— Хто? Косьця зьменіць?! Ды ты паглядзі на яго! Зьменіць ён. Што ён зьменіць... — нецьвяроза абураўся Жэка.

Мама ня спала. Сядзела ў гасьцёўні пры стале. Калі Кастусь зайшоў, ускочыла.

— Напіўся, — віскнула яна. — Вось чым вы там на сваіх гэтых зьездах займаецеся! Вось чаму вас там апазіцыя навучыла! Ану ідзі спаць, п'яніца! І заўтра штоб паехаў са мной на дачу. А то саўсем ужо абляніўся. Нічога ня робіш, толькі па зьездах лазіш, напіваешся.

Мама ўтаропілася ў Кастуся сваім птушыным вокам і, карыстаючыся сытуацыяй, гучна выказвала сваю пэнсіянэрскую крыўду на ўвесь сьвет.

— Успакойся, — сказаў Кастусь ды пайшоў сабе спаць.

І прысьніў дзіўны сон. Нібыта ён, Кастусь, ва ўрачыстым малінавым мундзіры, з эпалетамі, аксэльбантамі й іншымі ўпрыгожаньнямі, прымае прысягу. Гэта, напэўна, прэзыдэнцкая інаўгурацыя. Наўкола шмат кветак, шмат людзей, чынавенства, але твары ў гэтага чынавенства не такія, як па тэлевізары, — азызлыя, стомленыя ад жыцьця, махлярскія й прапітыя, — не! Сьветлыя, рашучыя, сумленныя... У залі, дзе праходзіць інаўгурацыя, шмат людзей. Усе ўрачыстыя, вясёлыя, зьзяюць усьмешкі, дзеці сядзяць на плячах у бацькоў... Кастусь нешта прамаўляе, і словы гэтыя важкія і істотныя для кожнага жыхара краіны, назва якой залатымі літарамі выбітая над трыбунаю — Міларусь...



Славамір АДАМОВІЧ

## Пісьмо каханай з Краіны Паўночнага Шляху

*Натальлі М.*

Мілая, падумай, тут няма
ні жытоў, ні васілёчкаў сініх…
Ведаеш, тут вельмі шмат цямна,
і тунэляў, і электраліній.

Любая, тут холадна зімой,
горы тут зусім не з даламіту,
летам тут у кволы травастой
шыюцца лесавічкі-рахіты.

Сьмешная, тут людзі, як і мы, —
белыя зь зялёнымі вачыма.
Праўда, ў іх драўляныя дамы,
чысьціня вакол і дабрачыннасьць.

Родная! Я ўсё яшчэ люблю
гэны край,
дзе ты жывеш за мужам.
Толькі лепш свайго не пакідай
і ня йдзі за іншага у сьцюжу.

стрэчу зь ім пад час свайго знаходжаньня ў Менску. Джэймс Лукашэнка сьцьвярд-



**Максім Мірны** трапіў у дваццатку найлепшых тэнісістаў сьвету. За тыдзень здолеў прасунуцца з 27-е пазыцыі на 18-ю. У парным разрадзе ён увогуле лідэр. Мірны дае прыклад спартоўца, які робіцца культавым, не ствараючы вакол сябе надзіманых скандалаў. Процілегласьць яму — зоркі нашага футболу Бялькевіч з Хацкевічам. Іх новы выбрык: яны адмовіліся гуляць за зборную Беларусі пад начальствам Байдачнага, матывуючы гэта «цяжкім маральным станам». От халера!..

**Аляксандар Лукашэнка** запатрабаваў ад ураду аднавіць дзейнасьць выцьвярэзьнікаў, зрабіўшы пры гэтым іх рэнтабэльнымі. Гэта па-гаспадарску! Беднае БТ: даводзіла-даводзіла, што выцьвярэзьнікі ня трэба, цяпер кажы адваротнае.

Тым часам у Беларусь прыбыў 36-гадовы жыхар канадзкага гораду Вініпэг Джэймс Лукашэнка.


Мірны

AP

## Лукашэнка Джэймс



КП В БЕЛАРУСИ

Ён называе сябе траюрадным пляменьнікам Аляксандра Лукашэнкі і спадзяецца на сустрэчу зь ім падчас свайго знаходжаньня ў Менску. Джэймс Лукашэнка сьцьвярджае, што ягоны прадзед, а таксама дзед Аляксандра Лукашэнкі былі братамі і разам жылі ва Ўкраіне. У пачатку мінулага стагодзьдзя продкі Джэймса Лукашэнкі пераехалі ў Канаду, а дзед Лукашэнкі — у Беларусь.

**Аляксандар Папкоў** прызначаны намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. На Папкова ўсклалі рэфармаваньне аграсэктару, кадравую і рэгіянальную палітыку. Магчыма, яму даручаць кантраляваць дзейнасьць Вышэйшай атэстацыйнай камісіі і Раду рэктараў. Толькі што звальнялі за «падман прэзыдэнта», і во — зноў прызначаюць.

**Мэнахему Бегіну**, прэм'ер-міністру Ізраілю з 1977 да 1983 г., ляўрэату Нобэлеўскай прэміі, 16 жніўня споўнілася б 90 гадоў. Берасьцейская габрэйская грамада зьбіраецца з часам павесіць мэмарыяльную дошку на будынку, дзе перад вайной жыў Бегін. Цяпер там — дарэчы, пра выцьвярэзьнік — наркалягічны дыспансэр.

**Ян Буш**, кіраўнік моладзевага крыла Сацыял-дэмакратычнай партыі Нямеччыны, быў дэпартаваны зь Беларусі 16 жніўня. «КДБ, што добра, даў мне час кантактныя лінзы паставіць і забраць асабістыя рэчы», — расказаў Буш па тэлефоне карэспандэнту «НН». За шлях дадому ён


Буш

плаціў сам.

**Злачынцы** падурнелі ад гарачыні: адзін рабаўнік у Пінску, уцякаючы ад пагоні, скочыў, з нарабаваным у руках, з чацьвертага паверху ды атрымаў чэрапна-мазгавую траўму. А чатыры адорвы ў Менску скралі тралейбус з прыпынку ды мазнуліся ў сьвятлафор.

**Люсьен Абэнгайм**, галоўны лекар Францыі, падаў у адстаўку: на ягонае ведамства пасыпаліся абвінавачаньні ў хаваньні сапраўдных памераў шкоды ад сонечных апёкаў за апошнія два тыдні. Во яна, дэмакратыя.



IREX-PROMEDIA

**Кітаянка Ма Лігуа** з Сынгапуру паставіла стаймя адна за адной 303621 костку даміно. Яны падалі ланцужком каля пяці хвілінаў. Во дзе цярплівасьць! На стварэньне «кампазыцыі» пайшло сем тыдняў. Вакол сваёй «дарогі» Ма расклала пахнючае лісьце, каб адпалохваць інсэктаў, расставіла пасткі на пацукоў. І ўсё ж якісьці жук адным махам зваліў былў 10 тыс. костак.

**Таху Ясін Рамадан,** віцэ-прэзыдэнт Іраку за Хусэйнам, схоплены. Не дапамагла й сялянская адзежа. Садам, калі жывы, пакуль на волі. Увесь Багдад заклеены ўлёткамі-каляжамі: Хусэйн у вобразе Элвіса Прэсьлі, Хусэйн у хакейнай форме (sic!) з надпісам «Camels» (вярблюды) на саколцы і г.д. Ці то амэрыканцы гэтак дэсакралізуюць вобраз Садама, ці то вучацца пазнаваць яго пад любым соўсам.

## Людміла Пастаялка

**Ведамства міністаркі аховы здароўя Людмілы Пастаялкі** (на здымку зьлева) скараціла колькасьць платных месцаў ва ўсіх мэдычных ВНУ ўдвая. Прычым зрабіла гэта задняй датай. Падаваць дакумэнты ў іншыя ВНУ позна — іспыты сканчыліся. «Хто не папаў сёлета, раю два шляхі: пайсьці на падрыхтоўчае аддзяленьне ці паспрабаваць свае сілы налета. Трэцяга няма», — пракамэнтаваў сытуацыю рэктар Менскага мэдінстытуту сп.Беспальчук. Зрэшты, для хлапцоў трэці шлях існуе: войска.

**СМ**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Алега з Гомелю** віншую з Днём народзінаў. Зычу ўсяго найлепшага. Жыве! Рэчыцкі студэнт

**Рэнуся Малога** віншую з Днём народзінаў. Бандыт

**Шаноўнага Алеся Сушчэўскага** віншую з Днём народзінаў. Зычу моцы, надзеі і незалежнасьці. Сябар Зьмітрок

**Вітаю** Насту К., Таню С. з Рагачова, Юлю Б. з Бабруйску, Алесю К. з Воршы, увесь трэці рускі. Паліна Г.

**1 верасьня** — Дзень ведаў і Дзень народзінаў нашага рэктара **Міхала Васілевіча Селькіна**. Віншую. Студэнт

**Андрусь Шпакаў!** Віншуем з Днём народзінаў. Ты нават маўчыш па-беларуску, і мы цябе вельмі любім за гэта. Не хварэй доўга, твая шпакоўня чакае цябе. Неба і зоры

**Віншуем** Уладзімера Аляксеевіча Арлова зь юбілеем. Зычым усяго найлепшага. Рэчыцкія людзі

**Нябесная Беларусь** віншуе аднаго са сваіх найлепшых творцаў і змагароў У.Арлова зь юбілеем

**Беларускія ліцэісты** дзякуюць Уладзімеру Арлову за падтрымку й зычаць гэткіх жа файных чытачоў, як яны!

**Шлях наш ліцэйскі просты:** Хай гоняць з будынку далоў, Іконы у ход наш хросны — Мапа, Асадка, Арлоў

**Любімага пісьменьніка** Ўладзімера Арлова віншуем з Днём народзінаў і зычым натхненьня ў творчасьці й каханьні

**Дзякуй Вам,** найшаноўны У.Арлоў, за тое, што далі нам жыцьцё. Літаратурныя героі вашых твораў

**Ліцэісты НДГЛ вераць:** прэзэнтацыя кожнай новай кнігі У.Арлова будзе адбывацца ў нашай актавай залі

**Гісторыка, пісьменьніка** і проста выдатнага чалавека У.Арлова віншуем з самай круглай датай у жыцьці

**Кожная кніга У.Арлова** — цагліна ў падмурак нашага Беларускага Дому. Ад Яго імя — віншаваньні з Днём народзінаў

**Сп.Уладзімер!** Сьпяваем у гонар Вашых Народзінаў: «З намі Арлоў-абаронца, будзем стаяць бясконца…»

**22 жніўня** Сяргей з Рэчыцы адзначае Дзень народзінаў свайго старасты. Далучайцеся! Паліна Г.

### КАНТАКТЫ/ПРОДАЖ

**Дрэўцы** ружы кітайскай ці суданскай прадам танна. Т.: 221-21-81. Слава

**Прадам** ложак падлеткавы, памер 165/74 см (б/у, у добрым стане), танна. Т.: 220-25-77

**Vyšyvaju** tradycyjnyja biełaruskija kašuli z symbalami Ziamli, Sonca, Jaryły j h.d. Tku pajasy na doščačkach. T. (u Homeli): (02322) 30-5-42. Taciana

**Бясплатна** вышлю як zip або doc Сьпіс беларускіх навуковых назваў 638 птушак Эўропы (лаціна — расейская — беларуская). Harrier@tut.by

**Новая праграма** для трансьлітарацыі тэкстаў з кірыліцы ў лацінку на geocities.com/ Belarus.coins/ cyrlat.html

**Чарговы фэст** «Крапіўна-2003» адбудзецца 6 верасьня, пачатак а 18 гадзіне. Будзьма разам. Т. для даведак (у Воршы): 5-25-40, увечары. Генадзь

**Зьбіраем сродкі** на ўпарадкаваньне магілы В.Іваноўскага. Далучайцеся. Сябры Кальварыйскай рады БНФ. Т.: 215-04-30

**Экспэрымэнт** выцясьненьня беларускай мовы з навін на БТ ажыцьцяўляюць Я.Рыбакоў і А.Мартыненка. Патэлефануйце ім. Т.: 263-77-66, 263-82-58(56)

**Сяргей Мудрачэнка,** капітан каманды БНФ, «у час змаганьня, у моманты высокага эмацыйнага і фізычнага напружаньня» вылазіць сапраўднае зьмесьціва чалавечага сэрца. І, зразумела, за матамі і расейская мова, бо ў нашай мове маты не дапасоўваюцца і ў яе не «ўплятаюцца». Узьнікае пытаньне, а што вы зьбіраецеся адраджаць?

### КВАТЭРА

**Здыму** пакой у маланаселенай кватэры на доўгі тэрмін. Аляксандар. Т.: 225-18-50

**Здыму** пакой для адной альбо для дзьвюх студэнтак на вучэбны год. Т.: 225-18-50

**Малады навуковец** здыме пакой недалёка ад мэтро. Своечасовасьць аплаты і парадак гарантую. Т.: 214-42-14, 213-30-29

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — п/с 333, 220050, Менск, e-mail: exlibris@tut.by, Internet: http://exlibris.cjb.net. Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае:** Андрэй Хадановіч «Старыя вершы», Антон Луцкевіч «Да гісторыі беларускага руху», зборнік вершаў Віктара Жыбуля «Дыяфрагма». Т.: 8-029-643-57-33

**Прадам:** Рогалеў «Сьцежкі ў даўніну» (геаграф. назвы Палесься), «Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах». Т.: 251-19-52. Тацяна

**Прадам** Доўнар-Запольскі «Гісторыя Беларусі», Шуба «Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў». Т.: 251-19-52. Тацяна

**Прадам** «Фразэалягічны слоўнік мовы твораў Я.Коласа». Т.: 251-19-52. Тацяна

**Прадам** поўныя камплекты літаратурнага альманаху «Ксэракс беларускі» і часопісу «Калосьсе». Т.: (0214) 41-85-19

**Прадам** «Апошнія вершы Леаніда Галубовіча», 3200 руб. Полацак-13, п/с 14, т.: 21-14-13

**Куплю** «Сад на капялюшынку каханай» Р.Баравіковай, «Крыло анёла» Э.Акуліна. Т.: 251-19-52. Тацяна

**Прадам:** «Бульба» (энц. даведнік), «Краткий словарь по логике», «Золото партии». Т.: 251-19-52. Тацяна

**Кнігі,** аўдыё, відэа, CD у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00. Т.: 45-11-51

**У Гомелі** можна набыць кнігу «Краіна Беларусь». Т.: 45-11-51

**Беларускія касэты,** кампакты і кніжкі незалежных выданьняў у Горадні. У панядзелкі, серады і пятніцы па адрасе: вул.Маркса, 11 (другі паверх) з 17 да 20 гадзін. Замовы праз т.: 8-029-640-46-36. Навіны на сайце http://michelson.by.ru

### ПАДАРОЖЖА

ЗБМ «Беларускі Шлях» запрашае на **падарожжа**: Залесьсе—Смургоні—Кушляны—Жупраны—Ашмяны—Гальшаны—Баруны—Крэва—Валожын. 30 жніўня (субота). Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20, Зьміцер

«Наша Ніва» дзякуе за падтрымку царкве «Ласка Божая»

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Віталю С. зь Менску.** А чаму пэдагог Колас ня мае права займацца палітычнай дзейнасьцю ў вольны ад працы час?

**Алесю Г. з Барані.** Ня варта выбудоўваць рэфлексію ад рэплікі А.Лукашэнкі. У справах культуры ён не аўтарытэт.

**Dol.by.** Дыфэрэнцыяцыю паміж словамі *зоркавы* і *зорны* рэкамэндуе праводзіць акадэмічны «Русско-белорусский словарь» у 3-х тамах. Паводле яго, для акрэсьленьня паняцьцяў, зьвязаных з зоркамі, служыць прыметнік *зоркавы*: *зоркавая маса, зоркавы дождж*. Слова ж *зорны* прапануецца ўжываць у значэньні *'ўсеяны зоркамі'*: зорнае неба, зорная ноч. У словазлучэньні «зоркавыя войны» значэньне прыметніка бліжэйшае да першага выпадку.

**Зьмітру П. з Кастрыцы.** Немэтазгодна пісаць пра спорт паводле матэрыялаў іншых выданьняў ды Інтэрнэту.

**Сяргею К. зь Сянна.** «Споведзь» выпісаная слабавата.

**І.С. зь Віцебску.** Вашыя спэктральныя памяткі запазьніліся.

## IN MEMORIAM

# Яна ўжо з Ларысай

У ноч з суботы на нядзелю ў Баранавічах памерла шчырая беларуская патрыётка Тафілія Дудко (1928—2003). За ўдзел у СБМ яна была асуджаная савецкімі ўладамі. Адбывала пакараньне на Інце, а потым у Казахстане — восем гадоў. На Інце яна пазнаёмілася й пасябравала з Ларысай Геніюш. Сяброўства цягнулася шмат гадоў. Спн.Тафілія часта наведвалася ў Зэльву да Геніюшаў. І сёлета 9 жніўня яна, ужо моцна хворая, разам з мужам сп.Іванам (зь якім таксама пазнаёмілася на Інце) наведала ўрачыстасьці ў Зэльве.

На пахаваньні 18 жніўня сабралося шмат народу. Былыя вязьні сталінскіх лягераў, сябры абодвух БНФ, шчырыя патрыёты прыйшлі разьвітацца зь ёю. Уніяцкі сьвятар а.Маліноўскі адправіў імшу.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3421. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 01.00 20.08.2003.

Замова № 4309.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а